ПРАЛЕТАРЫ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

№ 154 (3262) Аўторак, 9-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—81[illegible] [illegible]—781

ПОЧТА.

БЭРЛІН, 8. Судовая ўлада аспабаніла пад залог рэдактароў „Ротэ Фанэ"—Гірша і Спанга, арыштаваных па абвінавачаньні ў „Дзяржаўнай здрадзе".

ПАРЫЖ, 8. Былы аўганскі падышах Амануллы прыбыў учора ўвечары ў Марсэль.

ЗНОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Вылучэньне батракоў на каапэрацыйную работу

ЦП саюзу працаземлес пастанавіла вылучыць рад батракоў на адказную работу ў пізавой каапэрацыі. Для падрыхтоўкі вылучэнцаў—40 батракоў будуць накіраваны на спэцыяльна адкрытыя курсы пры Белкаапсаюзе, 10 чалавек на каапэрацыйныя курсы пры БУД і 20 батрачак на жаночыя каапэрацыйныя курсы.

ДА ЗЬЕЗДУ ЗАРУБЕЖНЫХ ПАЛЯКАЎ У ВАРШАВЕ

На зьезд дапускаюцца толькі прыхільнікі фашызму

Усе дэлегацыі павінны „стаяць на пляцформе польскай дзяржаўнасьці"

ВАРШАВА, 6. Урадавая газэта «Эпока» спрабуе абгрунтаваць пастанову арганізацыйнага камітэту зьезду зарубежных палякаў, якая адным росчаркам пяра закрыў доступ на гэты зьезд польскім працоўным масам СССР.

«Зьезд,—піша газэта,—скажаецца для абгаварэньня культурных і агульных пытаньняў дэлегацыямі, які ўсе бяз выключэньня стаяць на пляцформе польскай дзяржаўнасьці. Само сабою зразумела, што ўсім тым асобам, якія адмаўляюць польскую дзяржаўнасьць, няма чаго рабіць на зьезьдзе».

Далей «Эпока» заяўляе, што калі нават і існавалі яшчэ якія-небудзь сумненьні адносна прынцыповай устаноўкі арганізатараў зьезду палякаў у СССР, дык гэтыя сумненьні былі расьсеяны савецкім друкам. Спасылаючыся па паведамленьні савецкага друку аб скліканьні ўсесаюзнага зьезду палякаў у Маскве і на прамову тав. Пшыбышэўскага, «Эпока» прыходзіць да вываду, што «мэтаю ўсесаюзнага зьезду зьяўляецца прапаганда бальшавіцкага ладу і сеяньне нянавісьці да Польшчы».

У пошуках довадаў «Эпока» робіць вывад, што правядзеньні выбараў на зьезды палякаў у СССР на падставе савецкага выбарнага права пазбавіла права ўдзелу шырокія пласты польскага насельніцтва СССР.

Нарэшце, «Эпока» палкам ухваляе пастанову арганізацыйнага камітэту аб недапушчэньні дэлегацыі СССР на зьезд. Газэта выказвае здавальненьне, што на зьезьдзе зарубежных палякаў ня будзе выступленьняў «асоб, якія ня прызнаюць польскае дзяржавы і імкнуцца ўсімі сіламі да барацьбы з яго ладам».

Праграма зьезду

МАЛЕБНЫ, АБЕДЫ, ПРЫЁМЫ Ў ПРЭЗЫДЭНТА

ВАРШАВА, 6. Арганізацыйны камітэт зьезду зарубежных палякаў апублікаваў праграму зьезду. 14-га ліпеня ў дзень адкрыцьця зьезду, адбудзецца «урачыстая імша», прыём дэлегацый у прэзыдэнта рэспублікі і г. д. Наступныя тры дні будуць працаваць толькі камісіі зьезду, а дэлегаты «будуць знаёміцца з горадам».

Толькі 18 ліпеня адбудзецца другое і апошняе пасяджэньне **«для галасаваньня рэзалюцый, запрапанаваных камісіямі».** Пасьля закрыцьця зьезду адбудзецца **абед,** пасьля чаго дэлегаты адправяцца ў Тарунь (Пазнань), дзе дэлегаты будуць **аглядаць выстаўку.**

Такім чынам, дэлегаты будуць прымаць у работах зьезду самы нязначны ўдзел: уся работа сканцэнтруецца ў камісіях, а **пленарныя пасяджэньні будуць мець нязначны дэманстрацыйны характар.**

Рэзалюцыя-пратэст усерасійскага зьезду працоўных палякаў супроць недапушчэньня на варшаўскі зьезд савецкай дэлегацыі

«Усерасійскі зьезд прадстаўнікоў польскіх працоўных мас, заслухаўшы інфармацыю аб адмаўленьні варшаўскага арганізацыйнага камітэту дапусьціць савецкую дэлегацыю на варшаўскі зьезд, з вялікім абурэньнем канстатуе, што гэта спроба заглушыць голас 200.000 працоўных палякаў РСФСР наглядна выкрывае клясавы твар арганізатараў зьезду.

Няма сумненьня, што варшаўскі камітэт, пазбаўляючы нашу дэлегацыю права ўдзелу ў зьезьдзе зарубежных палякаў, дзейнічае ў інтарэсах польскіх фашыстых і імпэрыялістых, **якія жадаюць зьезд скарыстаць у мэтах ваеннай падрыхтоўкі супроць СССР, для згуртаваньня вакол польскага фашызму польскіх эміграцкіх мас, і нарэшце, у мэтах ілжывага і паклёпніцкага асьвятленьня становішча польскага насельніцтва ў СССР.**

Ад імя 200.000 працоўных палякаў РСФСР **катэгарычна пратэстуем супроць спробы адвесьці нашых дэлегатаў ва ўгоду міэрнай варожай польскім працоўным масам кучцы паразітаў, пазбаўленых выбарнага права ў сілу нашай, крывёю здабытай Савецкай Канстытуцыі.**

Варшаўскім паном не падабаюцца нашы адмоўныя адносіны да так званага нацыянальнага адзінства і наш лёзунг міжнароднай клясавай салідарнасьці працоўных.

Мы, рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігэнцыя, заяўляем, што на ўласным крывавым вопыце адчулі сутнасьць гэтага адзінства. **Няма і ня можа быць адзінства паміж эксплёататарам і эксплёатуемым, паміж фабрыкантам і рабочым, паміж памешчыкам і працоўным селянінам. Мы будуем сваю нацыянальную культуру без памешчыкаў і фабрыкантаў.**

Ніколі яшчэ разьвіцьцё сапраўднай народнай культуры ў гісторыі польскіх працоўных мас не ахапляла гэтых мас так шырока і ўсебакова, як іменна ў нас, у савецкіх рэспубліках. **З пічбамі ў руках нашы дэлегаты давядуць, як у нас, у краіне дыктатуры пралетарыяту, будуецца польская нацыянальная культура. Што-ж датычыць адзінства, то іменна ў нашых савецкіх рэспубліках ажыцьцёўлена адзінства, аб якім чалавецтва марыла стагодзьдзямі, адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй, якія разам будуюць сваё жыцьцё на сацыялістычных падставах.**

Усерасійскі зьезд прадстаўнікоў польскага працоўнага насельніцтва прапануе сваім дэлегатам па ўзгадненьні з дэлегатамі Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі ўнесьці ў парадак дня варшаўскага зьезду наступныя даклады: аб становішчы польскіх працоўных мас СССР, даклад Мархлеўскага раёну, вырашэньне аграрнага і сялянскага пытаньняў у адносінах польскіх сялян СССР, становішча польскіх рабочых у СССР, будаўніцтва польскай нацыянальнай культуры ў СССР, польская прэса і літаратура ў СССР, міжнацыянальныя адносіны ў СССР, жаночае пытаньне ў СССР.

Мы катэгарычна патрабуем ад варшаўскага камітэту перагляду сваёй пастановы і дапяшчэньня нашай дэлегацыі на варшаўскі зьезд. 200.000 польскіх рабочых, сялян і працоўнай інтэлігэнцыі чакаюць неадкладнага адказу».



Б. Пшыбышэўскі, абраны на варшаўскі зьезд ад працоўных палякаў РСФСР

Падрыхтоўка да міжнароднага чырвонага дня

Парыскі пралетарыят выбірае камітэты

Заклік унітарнага прафсаюзу гарнякоў

ПАРЫЖ, 5. На прадпрыемствах парыскага раёну ўжо прыступлена да арганізацыі камітэтаў па правядзеньні міжнароднага чырвонага дня. На адным з прадпрыемстваў на першым сходзе камітэтаў па правядзеньні анты-ваеннага чырвонага дня былі абраны дэлегаты на рабоча-сялянскі зьезд, які склікаецца на 14-га ліпеня.

Унітарны прафсаюз горнарабочых апублікаваў адозву, у якой заклікае ўсіх горнарабочых 1-га жніўня не працаваць, а дэманстраваць супроць камітэту ШАХТБ (арганізацыя прадпрыемцаў) і супроць ураду, які падрыхтоўвае новы напад на СССР.

Вэнгэрская буржуазія перапалохана

ВЭНА, 5. Паводле паведамленьняў з Будапэшту, орган вэнгэрскага ўраду «Пэстэр Лёйд» вядзе ўзмоцненую кампанію супроць камуністых у зьвязку з падрыхтоўкай да анты-ваеннага чырвонага дня. Газэта заяўляе, што «трэці інтэрнацыянал зноў пераходзіць у генэральнае наступленьне і першым крокам у гэтым напрамку зьяўляецца выступленьне, якое рыхтуецца да 1-га жніўня». «Гэта новае камуністычнае наступленьне з жахлівай яснасьцю даводзіць,—піша газэта,—што рэвалюцыйныя намеры Масквы ўсё яшчэ існуюць. 1-га жніўня паслужыць повадам для самай рашучай барацьбы супроць сацыял-дэмакратыі. Таму сацыял-дэмакратыя ў інтарэсах самаахоны павінна пераглядзець тэзіс аб клясавай барацьбе».

Нарэшце, газэта выказвае надзею, што «намечаная на 1-га жніўня дэманстрацыя камуністых не схавацца ад пільнага вока улад».

Забарона міжнароднай маніфэстацыі ў Ахэне

БЭРЛІН, 6. Як паведамляе Кельнскі орган кампартыі «Социалистише Республик» («Сацыялістычная Рэспубліка») назначаная на 21-га ліпеня ў Ахэне міжнародная маніфэстацыя супроць імпэрыялістычнай вайны будзе забаронена акупацыйнымі ўладамі на падставе згоды паміж імі і нямецкімі паліцэйскімі ўладамі. У маніфэстацыі павінны былі ўзяць удзел рабочыя Нямеччыны, Францыі, Бэльгіі, Галяндыі і Люксембургу.

СТЫХІЙНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ЧАРНОВІЦАХ

ВЭНА, 5. Як паведамляе румынскі друк, у Чарновічах адбылася стыхійная дэманстрацыя рабочых у знак пратэсту супроць роспуску ўнітарных прафсаюзаў. Дэманстрацыя адбылася зараз-жа пасьля таго, як зрабілася вядомым, што суд зацьвердзіў пастанову пракурора аб роспуску ўнітарных прафсаюзаў. Некалькі дэманстрантаў было арыштавана.

С.-Д. МІНІСТАР ПАЗБАЎЛЯЕ БЕСПРАЦОЎНЫХ ДАПАМОГІ

БЭРЛІН, 6. Міністр працы Гіцэль (с.-д.) выдаў распараджэньне, на падставе якога звыш 30 тысяч беспрацоўных пазбаўляюцца дапамогі, якую яны атрымлівалі цяпер. Паводле загаду Гіцэля, дапамогі пазбаўляцца ўсе беспрацоўныя ва ўзросьце да 21 году, а таксама беспрацоўныя, якія атрымлівалі дапамогу «доўгі час».

ЗАБАРОНА КАМУНІСТЫЧНАЙ ГАЗЭТЫ

ПРАГА, 6. Мясцовая ўлада забараніла на адзін месяц штодзенны камуністычны орган «Правда», які выдаецца на румынскай мове.

Сьвята чырвонага спорту

30 чэрвеня 1929 г. у Бэрліне адбылося сьвята левых рабочых фізкультурнікаў, якое вылілася ў магутнае выступленьне рэвалюцыйнага спартыўнага руху. У ім удзельнічалі прадстаўнікі многіх замежных арганізацый. Фізкультурнікі на сілі сьцягі і плякаты з лёзунгамі супроць раскольніцкай палітыкі рэфарміотых у спорт-руху і ў абарону СССР. Чужаземныя дэлегацыі, апрача уласных сьцягаў, несьлі сьцяг СССР з падпісам: „Савецкім фізкультурнікам адмоўлена ў дазволе прыбыць на сьвята"

НА ЗДЫМКУ: дэманстрацыя фізкультурнікаў. Нясуць плякат: «Рабочыя спартсмэны, абаранайце Савецкі Саюз супроць нападу».

У нядзелю 30 чэрвеня на самым вялікім стадыёне Бэрліну было наладжана рабочае спартыўнае сьвята.

З пяці розных частак гораду спартсмэны з чырвонымі сьцягамі, з аркестрамі накіраваліся на спартыўны стадыён....

Вось праходзіць вялікая група чырвоных франтавікоў, апранутых у зялёныя кашулі. Паліцыя пакуль забараніла толькі зялёныя курткі.

* * *

Спартыўныя саюзы ў Нямеччыне—вялікая сіла. Буржуазныя спартыўныя саюзы аб'ядноўць больш 5 мільёнаў чалавек.

Усенямецкі рабочы спартыўны саюз, арганізаваны ~~у~~ год таму назад, аб'яднае 1.250 тысяч чалавек. Як і ва ўсіх старых рабочых арганізацыях Нямеччыны кіравалі гэтым саюзам меншавікі. Так было да апошніх год.

У 1926 гэдзе на зьезьдзе саюзу ў Гамбургу адзін з кіраўнікоў зьезду сказаў: «Трэба выкінуць з саюзу ўсіх тых, хто падпаў пад уплыў камуністых, пакуль гэты ўплыў не пасьпеў яшчэ моцна пашырыцца». Як, аднак ні стараліся меншавікі, уся «першая акруга» (Бэрлін Брандэнбург) пашла за камуністымі.

Усенямецкі спартыўны саюз выключыў усю 1 акругу—310 аб'яднаньняў, 26 тысячамі рабочых-фізкультурнікаў. Бэрлінская гарадзкая камісія па фізкультуры аднусьціла 25 тысяч рублёў меншавікам і столькі-ж буржуазным спартыўным саюзам. Рэвалюцыйным фізкультурнікам не далі, зразумела, ні гроша.

* * *

Гэтыя меры не дапамаглі. Ужо год існуе рэвалюцыйная «1 акруга» і ня толькі не распылілася, як ёй прадракалі, але яшчэ больш ўзмацнела і загартавалася. Сьвята ў Бэрліне паказала, што **рэвалюцыйныя фізкультурнікі ідуць у першых радох пралетарскай арміі.**

С. Б.

ГАСПАДАРЧЫ КРЫЗІС У ПОЛЬШЧЫ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА

Фашысцкі ўрад рыхтуецца да канчатковай ліквідацыі дапамогі беспрацоўным

Беспрацоўныя асуджаны на выміраньне ад галоднай сьмерці

Працоўнае сялянства стогне пад фашысцкім ботам

Зямельная і ўся палітыка фашысцкага ўраду накіравана на шпаркае разьвіцьцё капіталістычных адносін на вёсцы, на ўзбагачэньне абшарнікаў і кулакоў за кошт экспляёатацыі сельскага пралетарыяту і поўпралетарыяту і руйнаваньня асноўнай сялянскай масы.

Непасільныя падаткі, штрафы, драконаўскія законы, экзэкуцыі за нявыплату падаткаў і штрафаў даводзяць бядняцкія масы вёскі да дна галечы, даводзяць да глыбокага абурэньня супроць фашысцкага ражыму.

Абавязковыя загады бяліць сялянскія хаты, забарона раскладаць вогнішча на начлегах з мэтай, каб папярэдзіць частыя пажары лясоў, будова клазэтаў на кожным сялянскім двары, якія ў народзе носяць назову «славояк» ад прозьвішча міністра ўнутраных спраў гэнерала Славой-Складкоўскага і шэраг іншых недарэчных загадаў, накіраваных на экспляёатацыю і тэрарызаваньне асноўнай сялянскай масы, якая гіне ад бязхлебіцы і душыцца ад безьзямельля.

За невыкананьне ўсіх гэтых загадаў накладваюцца штрафы, кідаюць неплацельшчыка ў паліцэйскія казэматы.

Адзін дасужы статыстык падае ў газэце «Воля Люду», што **на «славойкі» сялянства патрацила 200 тысяч злотых, тады як школ і лазьняў на вёсках няма,** як досыць значная частка сялянства жыве яшчэ ў зямлянках.

Тая-ж кулацкая газэта «Воля Люду» падае алярмуючыя весткі аб становішчы вёскі ў Польшчы пад загалоўкам: «Неабходна шпаркія дарадчыя сродкі»: «З вёскі плывуць панурыя весткі. Гэта ўжо не жальба і не нараканьні, гэта голас роспачы! Нячуваны недахоп грошай, вострае зьбяднеьне вёскі ў працягу апошняга году, дарагоўля прамысловых прадуктаў, дэшавіэна прадуктаў земляробскіх, недахоп працы і заробкаў. З усёй няшчаднасьцю сьцягваюцца кароткатэрміновыя крэдыты, з той-жа няшчаднасьцю праз ліцытацыю спагяняюцца раты і процанты ад доўгатэрміновых крэдытаў, кожны дзень адбываюцца па вёсках экзэкуцыі за дзяржаўныя і самаўрадовыя падаткі, выцісканецца павышаная плата за страхоўку ад агня. Хто ня мае чаго прадаць, ідзе да ліхвяра і пазычае на 5 ці 6% ад сотні ў месяц, каб толькі ўнікнуць ліцытацыі, ці лепш кажучы адцягнуць яе на якісь час».

Да такой ацэнкі палажэньня на вёсцы ўжо дагаварылася кулацкая, згодніцкая прэса. Вязумоўна, што становішча працоўнага сялянства ў сапраўднасьці значна цяжэйшае.

А. С.

Безработныя Польшчы кінуты на галодную сьмерць

Побач з паглыбляючымся гаспадарчым крызісам у Польшчы ідзе больш нахабнае наступленьне на рабочую клясу з боку пануючых клясаў і іх фашысцкай дыктатуры, якія стараюцца ўвесь цяжар крызісу ўзваліць на плечы працоўных мас.

Капіталістычная рацыяналізацыя дайшла да кульмінацыйнага пункту. Рабочая сіла экспляёатуецца з найбольшай напружанасьцю. Рабочыя, вносячы хранічнае недаяданьне, працуючы па 16 гадзін у дзень, мкнуць пры варштатах. Армія беспрацоўных расьце. У рабочых кварталах узьнімецца эпідэмія хвароб і самагубстваў ад галечы і голаду.

Вось характэрныя лічбы, якія падае ўрадовая газэта «Эпоха». Гэтыя лічбы вельмі яскрава выяўляюць палітыку экспляёатацыі і ўціску фашысцкага ўраду: у 1926 годзе **ўрад выплаціў дапамогі для беспрацоўных 43.076.893 злот.,** у 1927 г.—**26.599,510 злот.;** у 1928 г.—**13.199.783 злот.** Такім чынам ва тры гады фашысцкага панаваньня дапамога беспрацоўным зьменшана **бадай у чатыры разы** ня гледзячы на тое, што лік беспрацоўных у апошні год пачаў шпарка расьці.

Аднак, урад капіталістых і абшарнікаў лічыць і гэтую дапамогу лішняй. Газэта «Глос Люблінскі» паведамляе: **«З дня 30-га чэрвеня г.г. трэба чакаць канчатковай ліквідацыі дзяржаўнай дапамогі для беспрацоўных на ўсёй тэрыторыі Рэчыпаспалітай Польшчы».** І гэта ў той час, калі дарагоўля пастаянна ўзрастае. Па афіцыйнай статыстыцы кошт утрыманьня ў Дамброўскіх капальнях узрос у маі месяцы на **2,47%** у параўнаньні з красавіком.

Вялікая ўсё ўзрастаючая армія беспрацоўных гораду і вёскі кінута ўрадам на выміраньне ад галоднай сьмерці. «Хлеба і працы», «Прэч фашысцкую дыктатуру»,—усё з большай пагрозай і пырэй раздаецца па фашысцкай Польшчы.

А. С.

Працэс 21 украінца у Львове

ВАРШАВА, 7. У Львоўскім акруговым суду скончыўся працэс 21-га падсудных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Украіны. Прысяжныя засядацелі адказалі адмоўна на ўсе пытаньні аб віноўнасьці падсудных у дзяржаўнай здрадзе. 9 падсудных апраўданы, рэшта—12 прызнаны вінаватымі «у злачынствах супроць парадку кіраўніцтва дзяржаваю» і засуджаны ад 10 месяцаў да 3-х год.

ФРАНЦУСКІ ДОЎГ АМЭРЫЦЫ

Пагроза ўрадавага крызісу ў Францыі

За стварэньне франка-нямецкага блёку

ПАРЫЖ, 5. Формула ратыфікацыі даўгавых умоў з Амэрыкай, якая прынята фінансавай камісіяй палаты і якая зьяўляецца няўжытнай для ўраду, выклікала вялікае замяшанье сярод груп урадавае большасьці. Друк, зьвязаны з групамі ўрадавай большасьці ня ўтойвае сваёй сур'ёзнай небясьпекі ва лёс ураду Пуанкарэ.

«Матэн», напамінаючы, што французскі ўрад вымушаны лічыцца з тым фактам, што ўрад ПАЗШ адхіліць усякую ўмоўную ратыфікацыю і ня зможа згадзіцца на ўключэньне агаворак у самы ратыфікацыйны закон, абвінавачвае апазыцыю ў ганебных манэўрах, накіраваных супроць ураду. Умоўная ратыфікацыя знаходзіць зусім ня мала абаронцаў сярод членаў урадавае большасьці, як з ліку прыхільнікаў ратыфікацыі, так і нязьменных яе праціўнікаў.

Паводле слоў «Эко дэ Пары» да прыхільнікаў умоўнай ратыфікацыі належаць дэпутаты розных урадавых фракцый, якія групуюцца вакол Франклен-Буйона-Рэйбэля і Піко.

Правыя газэты заяўляюць, што падзеньне габінэту або рэарганізацыя яго пад націскам апазыцыі пацягнуць за сабою прыход да ўлады левага ўраду, першым актам якога зьявіцца неадкладная эвакуацыя Рэйнскай краіны. З свайго боку радыкальны і сацыялістычны друк, растлумачваючы палітычны зьмест парляманцкай тактыкі апазыцыі, якая мае на мэце зрыў ратыфікацыі пры цяперашнім складзе ўраду, выкрывае асноўныя тэндэнцыі замежнай палітыкі апазыцыі.

Орган радыкалаў «Рэпублік» бароніць неабходнасьць імкнуцца да стварэньня франка-нямецкага блёку, паказваючы, што гэта першая ўмова стварэньня эўрапейскай фэдэрацыі ў мэтах выратаваньня Эўропы ад васальнай залежнасьці ад ПАЗШ. Газэта патрабуе неадкладнай эвакуацыі Рэйнскай краіны, у якасьці простага выніку прыняцьця Нямеччынай пляну Юнга. Газэта пратэсту супроць спроб Пуанкарэ дабіцца ад Нямеччыны новых палітычных уступак і папярэджвае, што цяперашняя замежная палітыка Францыі, абвастраючы яе адносіны з Нямеччынай, Англіяй і ПАЗШ няўхільна прывядзе да міжнароднай ізаляванасьці Францыі.

Чаму Францыя капітулявала

Францыя ў цяперашні час вельмі нагадвае гарачага каня, якому нечакана «нацягнулі лейцы». Калі параўнаць пазыцыю Францыі на рэпарацыйнай канфэрэнцыі экспэртаў і яе пазыцыю цяпер, у часе нерагавароў са Злучанымі Штатамі, дык кантраст атрымліваецца рэзкі і павучальны. Тон патрабоўнага крэдытора, тон надзьмуты і ганарысты зьмяніўся тонам, калі не нясьмелым дык ва ўсякім выпадку, тонам чалавека, які робіць вясёлы твар пры дрэннай гульні.

А гульня атрымліваецца ня зусім удалая. **Францыя была прымушана адступіць і фактычна капітуляваць перад Злучанымі Штатамі,** згаджаючыся на ратыфікацыю дагавору Мэлён-Бэранжэ. Дэманстрацыя палаты, якая даручыла ўраду дамагацца адтэрміноваьня жнівеньскага плацяжу, толькі падарвала замежна-палітычны прэстыж Францыі, ня даўшы ніякіх канкрэтных вынікаў, калі ня лічыць, што пытаньне аб ратыфікацыі згоды Мэлён-Бэранжэ і аб форме агаворак пераатварылася ў пытаньне ўнутранай палітыкі, на якім спрабуюць спэкульнуць як правыя, так і левыя. Правыя стараюцца захаваць цяперашні склад габінэту, а левыя дамагацца рэарганізацыі ўраду ўлева.

Якія-ж непасрэдныя прычыны, якія прымусілі Францыю так хутка капітуляваць?

Пытаньне аб ратыфікацыі згоды Мэлён-Бэранжэ

Пытаньне, як вядома, самае актуальнае. Ня спыняючыся на дыскусіі аб працэдуры ратыфікацыі і аб агаворках, што Францыя ня хоча ўзяць на сябе ў адносінах да Англіі і Амэрыкі большых абавязацельстваў, чым Нямеччына ў адносінах да Францыі, і што Францыя згодзіцца на ратыфікацыю толькі ў тым выпадку, калі ўсе ўдзельнікі плян Юнга, трэба а[illegible]ць надзвычайна характэрнае выступленьне Пуанкарэ. Пуанкарэ асабліва дамагаўся таго, каб агаворкі былі сфармуляваны вельмі асьцярожна. Паводле яго слоў, нельга рызыкаваць тым, каб выклікаць нездавальненьне крэдыторaў. Сваю небясьпеку Пуанкарэ тлумачыць наступным чынам: «Калі агаворкі будуць складзены ў вельмі рэзкім тоне, то магуць узьнікнуць надзвычайна сур'ёзныя затрудненьні пры ажыцьцяўленьні камэрцыялізацыі нямецкіх абавязацельстваў. Калі ПАЗШ не гарантуюць разьмяшчэньня нямецкіх абавязацельстваў на сваім рынку, дык камэрцыялізацыя зробіцца надзвычайна цяжкай. Такім чынам, адзіная выгада, на якую разьлічвае французская буржуазія, была-б згублена. Цікава і яшчэ адна заўвага Пуанкарэ наконт гарантый, якія ён патрабуе ад Нямеччыны. Пуанкарэ заявіў, што Францыя не падпіша ніякіх згод раней, чым Нямеччына не гарантуе ажыцьцяўленьне ў сябе скарачэньня выдаткаў на дапамогу беспрацоўным, зьніжэньне пэнсіі чыноўнікам і г. д. Гэта заява Пуанкарэ характэрна для тых мэтадаў, якімі мяркуецца выцягваць грошы з Нямеччыны.

Пуанкарэ было дана запытаньне: а што будзе, калі пасьля ратыфікацыі Францыяй згоды Мэлён-Бэранжэ, Нямеччына адмовіцца выконваць плян Юнга? На гэта быў даны адказ, што такая рэч зусім немагчыма, бо гэта разстроіла-б фінансы Францыі, Бэльгіі, Італіі і Англіі таму, на падставе арт. 231 Вэрсальскага дагавору, можна было-б зьвярнуцца да прымусовых мер.

Францыя і яе крэдыторы

На запытаньне аб адносінах Францыі да яе крэдыторaў, Пуанкарэ заявіў, што Францыя чакае толькі ўрэгуляваньня сваіх абавязацельстваў у адносінах да Злучаных Штатаў і Англіі дзеля таго, каб патрабаваць таго-ж ад сваіх крэдыторaў. Пуанкарэ паказаў, што патрабаваньні Англіі прадстаўляюць сабой вынік амэрыканскіх патрабаваньняў. Францыя, такім чынам, усёйвае такую-ж пазыцыю і патрабуе ад сваіх крэдыторaў, у прыватнасьці ад Румыніі і Грэцыі ўплаты іх даўгоў, таксама растэрмінаваных на 70 год. (Румынскі доўг Францыі складае 525 міл. франкаў, а грэцкі—175 мільёнаў франкаў).

Рэпарацыйны банк

У адносінах рэпарацыйнага банку было дана наступнае запытаньне: рэпарацыйны банк, відавочна, будзе карыстацца вельмі вялікай незалежнасьцю, якая можа выклікаць трывогу. Ці не зьявіцца, такім чынам, рэпарацыйны банк чымсьці накшталт звышдзяржавы. Якім законам, якому падатковаму рэжыму банк будзе падпарадкаваны. Ці не ўнясё ён сумяцінцу ў эканамічнае жыцьцё эўрапейскіх дзяржаў?

З адказам выступіў міністр фінансаў Шэрон, які заявіў, што ў часе канфэрэнцыі экспэртаў амэрыканцы адсоўвалі пытаньне аб рэпарацыях на другі плян, а на першым знаходзілася пытаньне аб банку. Гэта для амэрыканцаў мела дамінуючае значэньне і ў гэтых адносінах яны ня пойдуць ні на якія ўступкі.

І ў гэтым сэнсе характэрна, што загад амэрыканскага капіталу ня можа быць адхілены.

Пытаньне аб эвакуацыі Рэйнскай краіны

На запытаньні, даныя адносна эвакуацыі Рэйнскай краіны, адказваў Брыян. Ён адвёў напрок у тым, што ён стварыў паўны паралелізм паміж плянам Юнга і эвакуацыяй Рэйнскай краіны. Ён прызнаў толькі, што жэнэўскі пратакол прадугледзеў такую магчымасьць. Далей, ён паказаў, што «французскі міністар замежных спраў ня хоча нічога сказаць і ня хоча нічога ўдакладняць».

Такое становішча. Можна лічыць аусім відавочным, што незалежна ад таго, як будуць разьвівацца ўнутры-эўрапэйскія справы, Францыя ратыфікуе згоду аб даўгох са Злучанымі Штатамі.

А. Мадрэ.

„Візыты" імпэрыялістычных акул

Ангельская ваенная эскадра ў Даніі

КАПЭНГАГЕН, 2. Орган дацкай кампартыі «Арбэйтэрблядэт» паведамляе, што парты Капэнгагену і Оргуса паведалa ангельская ваенная эскадра з экіпажам у некалькі тысяч чалавек. Сацыял-дэмакратычны ўрад аказаў прадстаўнікам ангельскага мілітарызму найлепшы прыём.

Мэта паведваньня Даніі эскадрай, з аднаго боку, умацаваць ваенную сувязь паміж Даніяй і Англіяй і, з другога, вывучаць дацкае пабярэжжа Бальтыцкага мора.

Камсамольцы і маладыя рабочыя Капэнгагену і Оргуса скарысталі прыезд ангельскай эскадры для ўмацненьня анты-мілітарыстцкай работы. Яны пашралі сярод ангельскіх матрэсаў лятучкі, якія выкрывалі падрыхтоўку імпэрыялістычнага нападу на СССР.

„З візытам" у польскі порт Гдыню

РЫГА, 6. Латвійскі ваенны флёт, у складзе 3-х суднаў адправіўся «з візытам» у польскі порт Гдыню. Гэты візыт зьяўляецца адказам на паведаньне Латвіі польскімі ваеннымі суднамі ў мінулым годзе.

Румынія ўзбройваецца

ВЕНА, 5. Як паведамляюць з Бухарэсту румынская вышэйшая рада прыняла рад пастаноў «аб папаўненьні ўзбраеньняў Румыніі». Адначасова савет пастанавіў, што намечаныя ўрадам шосавыя дарогі і масты павінны будавацца «у адпаведнасьці са стратэгічнымі інтарэсамі краіны».

Гарматы для Юга-Славіі

ВЕНА, 1. «Арбэйтэр Цэйтунг» паведамляе, што 28-га чэрвеня з Карантыі ў Грац прыбылі два таварных цягнікі, нагружаныя гарматамі. Высьветлілася, што гэтыя гарматы належаць Югаслаўскаму ваеннаму міністэрству і адпраўлены для рамонту ў Чэха-Славакію на заводы Шкода. «Арбэйтэр Цэйтунг» адзначае, што замест кароткага шляху па лініі Шпільфэльд-Грацпільзэн гэтыя цягнікі былі адпраўлены па маршруце ў Гіфлау-Лезэн, пры чым яны пераехалі таксама італьянскую тэрыторыю.

НА ПРАЦЭСЕ АРЛОВА І К°

Зівэрт працягвае выкрыцьці

ПАКАЗАНЬНІ ДАРАДЦЫ МЮЛЕЙЗЭНА

Заключэньне амэрыканскага экспэрта

БЭРЛІН, 5. У сёньнешнім пасяджэньні суду па справе Арлова і Паўлаўскага працягваўся допыт Зівэрта, які падрабязна расказаў аб сваіх адносінах з Арловым і Паўлаўскім, пры чым назваў Арлова «злым гэніям» Паўлоўскага.

З паказаньняў Зівэрта высьвятлілася, што ў арганізаванай ім агентурнай сеткі галоўную ролю адыгрывалі Арлоў, Паўлаўскі, Крашкоў і палкоўнік Васільеў; гэта група дастаўляла яму шматлікія фальшыўкі. З ліку іншых сваіх агентаў Зівэрт асабліва часта называў Гаўрылава і Паўлава.

Ад Арлова і Паўлаўскага Зівэрт атрымаў, між іншым, тры сэрыі фальшывак, а іменна: «лісты ДПУ», «лісты Каміцтэрну» «лісты Форда».

Адказваючы на пытаньні абаронцы Паўлаўскага, Зівэрт заявіў, што Паўлаўскі прапанаваў яму абрабаваць савецкага дыпляматычнага кур'ера Цітова, сьцьвярджаючы, што Цітоў вязе з сабою буйныя грашовыя сумы. Гэту сваю заяву Зівэрт тут-жа поўнасьцю пацьвердзіў, агаласіўшы ўласнаручны ліст Паўлаўскага да яго. Пры гэтым Зівэрт прызнаў, што ён раіў Паўлаўскаму ажыцьцявіць свой плян і адначасова паведаміў аб гэтым пляне нямецкую ўладу.

Пасьля Зівэрта дапытваецца дарадца камісарыяту грамадзкага парадку Мюлейзэн, паказаньні якога нанесьлі новы моцны ўдар падсудным. Мюлейзэн заявіў, што **ўсе факты выдачы сакрэтных вестак чыноўнікамі камісарыяту грамадзкага парадку, што ўпамінаецца ў «лістах ДПУ» аказаліся суцэльнай выдумкай.** Паводле слоў Мюлейзэна, як толькі ён даведаўся аб тым, што Арлоў меў дачыненьне да дастаўкі гэтых дакумантаў, ён ні хвіліны ня сумняваўся больш у іх ілжывасьці. Таксама былі фальшывымі і іншыя дакуманты, якія паступалі раней «з тае-ж крыніцы».

Далей Мюлейзэн заявіў, што паводле вестак, якія ён мае з некаторых крыніц, **Арлоў хваліўся тым, што ўдзельнічаў у вырабе фальшывага «лісту Зіноўева».** Гэтую заяву, якая зрабіла ў зале суду вялікае ўражаньне, аўдзедка паўтарыў потым у сваіх далейшых паказаньнях.

Паказаньні Зівэрта і Мюлейзэна, аправя новага пацьвярджэньня падробкі дакумантаў, што пастаўляліся падсудным, з наяўнасьцю устанавілі, што шайка падробшчыкаў хаця-б і праз Зівэрта знаходзілася ў пастаянай сувязі з камісарыятам грамадзкага парадку і «іншымі нямецкімі ўстановамі».

БЭРЛІН, 6. У сёньняшнім пасяджэньні суду было заслухана заключэньне экспэрта Фоса. Ня гледзячы на тое, што Фос вядомы як «працаўнік бальшавізму», яго экспэртыза зьявілася рэзкім выкрыцьцём злачынай дзейнасьці беларгвардзейскай эміграцыі. Як адначыў Фос, у працягу апошніх 10 год расійскія эмігранты сыстэматычна напаўняюць увесь сьвет мноствам фальшывак. Ужо адна шматлікасьць пушчаных у зварот «расійскіх дакумантаў» даводзіць іх фальшывасьць. **У прыватнасьці, няма ніякага сумненьня ў фальшывасьці такіх дакумантаў, як «ліст Зіноўева» або фальшыўкі, накіраваныя супроць сэнатара ПАЗШ Бора.** Таксама зьяўляюцца бясспрэчна фальшывымі ўсе наогул дакументы, аб якіх ідзе гутарка ў гэтай справе. Далей Фос падкрэсьліў, што «інфармацыя, якая ўзьнікае з нянавісьці эмігрантаў да савецкага рэжыму, зьяўляецца інфармацыяй з самых мутных і атручаных крыніц»; пры гэтым ён выказаў жаль аб тым, што неафіцыяльныя ўстановы таксама карыстаюцца гэтымі крыніцамі.

Пераходзячы да характарыстыкі Арлова і Паўлаўскага, Фос назваў іх «істотамі з гнілой маральлю».

Нарэшце, Фос заключыў, што трэба змагацца ня толькі супроць тых, хто робіць фальшывыя дакументы, але і супроць тых, хто такія дакументы заказв

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

Жорстка, пабальшавіцку выкінуць з партыі ўсіх, хто сваім прабываньнем у яе радох адштурхвае ад партыі рабочых, батракоў і сялянскую беднату

Праверачная камісія выкрыла ў Фаніпальскай ячэйцы групу былых белагвардзейцаў і дэзэртыраў

Чыстка ўдарыла па недахопах

ЯК ІДЗЕ ПРАВЕРКА САМАХВАЛАВІЦКАЙ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Старшыня камісіі па праверцы і чысткі Самахвалавіцкай райпартарганізацыі т. Каран ў гутарцы з выехаўшым на месца нашым супрацоўнікам падзяліўся ўражаньнямі і некаторымі вывадамі па чысткі райпартарганізацыі.

— Намі праверены,—сказаў т. Каран,—ужо 2 самыя буйныя ў раёне парт'ячэйкі: **Самахвалавіцкая—35 партыйцаў і Фініпальская—19.**

На пытаньне—як камісія знаходзіць падрыхтоўчую работу арганізацыі да чысткі, т. Каран сказаў:

— Некалькі фактаў, якія зараз падам, красамоўна адказваюць на гэта пытаньне. На райпартсходзе стаяў дакład аб чысткі побач з цэлым радам іншых пытаньняў, таму зусім натуральна, што ён ня мог быць востра высунуты, як адна з галоўнейшых задач данага пэрыяду. Частка парт'ячэек пытаньня аб чысткі на сваіх агульных сходах ня ставіла. А ў выніку такой «падрыхтоўкі», не гаворачы нават пра батрацтва і беднату, партыйныя масы дрэнна разумеюць задачы чысткі.

Камісія, прыбыўшы на месца, склікала райпартсход, на якім стаяла пытаньне аб задачах чысткі. На гэтым сходзе прысутнічала да 250 чалавек беспартыйнага працоўнага насельніцтва. Тут нельга абмінуць такі момант. Пасьля дакладу аб задачах чысткі ніхто не выступаў. І толькі пасьля таго, як старшыня сходу разоў тры заклікаў прысутных, каб яны выказваліся, сход разварушыўся—пачалі таварышы выступаць. Але ў прэзыдыум ад беспартыйных паступалі запіскі: «мы баімся выступаць, бо калі скажам праўду ад некаторых партыйнах, нас будуць прасьледваць». Камісія ў сувязі з гэтым ужыла рад практычных мерапрыемстваў па азнаямленьні беспартыйных працоўных мас з задачамі чысткі, з лёзунгамі партыі ад самакрытыцы. Быў мабілізаваны партыйны раённы актыў і накіраваны ў вёскі для правядзеньня падрыхтоўчай работы.

Зашавяліліся і клясава-чужыя элемэнты: нэпманы і спэкулянты мястэчка, асобы, пазбаўленыя выбарчых праў. Яны пачалі сярод насельніцтва прапагандаваць: на што ўсе гэтыя сходы, ці варта на іх хадзіць усё роўна каго трэба выключыць, то камісія наперад намеціла... і г. д.

Камісія разам з партарганізацыяй процідаставілі гэтай варожай нэпманскай агітацыі работу па растлумачэньні задач чысткі сярод местачковай беднаты.

Нельга не паказаць на такі недапушчальны момант у падрыхтоўцы партарганізацыі да чысткі. Ніводная з ячэек не прапрацавала інструкцыі ЦКК да прыезду камісіі.

Адносна самых праверачных сходаў трэба сказаць, што яны праходзілі з надзвычайнай актыўнасьцю. Дзеславыя выступленьні, дзесяткі сур'ёзных угрунтаваных пытаньняў пры праверцы кожнага з камуністых дапамаглі камісіі выявіць палітычна-клясавы твар кожнага партыйца.

Характэрна, што прысутныя на сходах задавалі пытаньні праяраемым больш за ўсё з тэй галіны работы, якою ён кіруе і тэта садзейнічала выяўленьню раду недахопаў, якія мелі месца ў рабоце тых ці іншых устаноў на працягу апошняга пэрыяду. Актыўнасьць мас дапамагла камісіі выкрыць рад асоб, якім ня месца ў нашай партыі. Так, па **Самахвалавіцкай ячэйцы выключана з партыйных радоў 6 чалавек** за розныя праступкі як: сувязь з кулацтвам, злоўжываньне на службе, недапушчальная халоднасьць і інш.

Клясава чужыя элемэнты імкнуліся выкарыстаць чыстку для дыскрэдытацыі партыі. На кожны са сходаў пралезьлі асобы, пазбаўленыя выбарчых праў, але яны выкрываліся прысутнымі і выступаліся са сходу. На адным сходаў падкулачнік выступіў і абвінавачваў ячэйку ў зажыме: як гэта нам заўсёды кандыдатуры рацць—крычаў падкулачнік. Гэты падкулачнік, выступіўшы адкрыта супроць партыйнага кіраўніцтва, атрымаў жорсткі адпор. Беспартыйныя масы расказалі камісіі аб тым, што ён сарваў не адзін сход сялян.

Чыстка,—сказаў у канцы т. Каран,—абярнулася ў праверку ўсяе работы арганізацыі, яна ўскрыла рад адмоўных зьявішч у рабоце як самых ячэек, так і іншых устаноў і арганізацый. Асабліва абураючыя факты выкрыты ў Фаніпальскай ячэйцы.

Кучка былых белагвардзейцаў начале ячэйкі

ЗАЖЫМ, П'ЯНСТВА, СКЛОКІ, СКАЖЭНЬНЕ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ, МЯШЧАНСКА-АБЫВАТАЛЬСКІЯ ПЛЁТКІ ЗАМЕСТ ДЗЕЛАВОЙ РАБОТЫ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

На працягу цэлага тыдню камісія ў складзе т. т. **Карана, Клокалава і Нікіцкага** правярала **Фаніпальскую ячэйку КП(б)Б** (Самахвалавіцкі раён, Менскай акругі). Цэлы тыдзень напружанай работы быў адданы на выяўленьне становішча і работы ячэйкі.

Перш за ўсё цікава паставіць пытаньне: як гэта ячэйка рыхтавалася да чысткі партыі? Як толькі камісія прыехала ў ячэйку, то ёй паказалі тое памяшканьне, дзе мае адбыцца праверачны сход.

— Сюды-ж ня ўмесьціцца сход,—сказаў аьдзіўлена старшыня камісіі, аглядзеўшы памяшканьне.

— Ды што вы, тут яшчэ вольнага месца будзе шмат, — запэўніваў мясцовы партыец.

— Дык нуўжо-ж вы так слаба падрыхтавалі беднату ды сераднякоў да чысткі?

— Як сказаць, ставілі пытаньне аб чысткі на сходзе, але на ім прысутнічалі толькі тры беспартыйныя кабеты, прабавалі гаварыць аб чысткі, але ніхто нас і слухаць не хацеў.

Чаму-ж ня слухалі беспартыйныя сяляне беднякі і сераднякі партыйцаў фаніпальскай ячэйкі?

На гэта пытаньне адкажуць тыя факты з жыцьця і работы ячэйкі, якія зараз выкрыты праверачнай камісіяй. На чале кіраўніцтва ячэйкі — яе адказны сакратар **Бабель**, былы белагвардзеец. Ён служыў у чэхаў, потым у Калчака аж да канчатковага разгрому гэтага бела-бандыта. Бабель сваю службу ў белагвардзейцаў у сваіх дакумантах як партыйных, так і інш. прадстаўляе, як службу ў радох Чырвонай армії.

Стан ячэйкі ад кіраўніцтва такой асобы ясны: п'янства, разлажэньне, змычка з клясава-варожымі элемэнтамі, абыватальска мяшчанскія плёткі з боку некаторых «партыйцаў», адсутнасьць якой-бы там ні было культурнамасавай работы панавалі на працягу досьць доўгага пэрыяду ў ячэйцы.

У ячэйку прынялі былога афіцэра **Васкабовіча і яго жонку,** пры гэтым за гэту «блізкую да партыі» сям'ю паручаўся сам сакратар ячэйкі **Бабель.**

Пасьля таго сходу, на якім прынялі ў партыю **жонку Васкабовіча,** «актыў» ячэйкі забраўся на кватэру партыйца **Вераб'ёва,** каб «спрыснуць прыём». «Спырсканьне» абярнулася ў павальную папойку.

Побач зазначым, што амаль кожная пастанова ячэйкі «спырскавалася» партыйным актывам і гэта «спырсканьне» ўвайшло ў традыцыю і разьвядала ячэйку.

На папойкі запрашаліся толькі «свае людзі», і досьць было прыехаць у ячэйку новаму партыйцу, як яго пачыналі выжываць і цкаваць. Аб разгортваньні самакрытыкі ня прыходзіцца і гаварыць. Калі прымалі ў партыю жонку Васкабовіча — былога афіцэра, які меў цесную сувязь з папамі і кулацкімі элемэнтамі, то некаторыя сумленныя партыйцы галасавалі супроць яе прыёму. Гэтых партыйцаў сакратар ячэйкі выклікаў і прыгразіў:

— Вы зрываеце справу росту, мы паставілі аб прабываньні вас у партыі... Яшчэ адзін яскравы факт. У сёлетнюю пасеўную кампанію ячэйка ўзяла саўгаскі трактар і заарала палі кулакоў.

Ці магла бедната слухаць такіх «камуністых»? Бязумоўна, не. Зараз, калі прыбыла ў ячэйку праверачная камісія, яна пачала разблытваць тыя брудныя белагвардзейскія дзеяньні, п'янства, склокі, плёткі і інш., якія заблытваліся ў Фаніпальскай ячэйцы вакол былога калчакоўца.

Разварушыўся беспартыйны актыў. Ён актыўна выступаў на праверачных сходах, дапамагаў у рабоце камісіі.

Камісія выкрыла ў Фаніпальскай ячэйцы да 7 былых белагвардзейцаў і дэзэртыраў. Пазаўчора камісія абвясьціла вынікі праверкі гэтае ячэйкі. З агульнага ліку праверaных 19 чалавек. 9 асоб выключаны з партыі, як клясава-чужы элемэнт, як асобы, якія разлажыліся і ня могуць праводзіць у жыцьцё партдырэктыў.

А. К.

Падкулачнікі і п'яніцы выключаны з партыі

(Смалявіцкая партарганізацыя, Меншчына)

Тры дні працавала праверачная камісія, правяраючы **Смалявіцкую** местачковую парт'ячэйку. На кожным сходзе прысутнічала па некалькі сот беспартыйных сялян, батракоў, працоўнага местачковага пасельніцтва. Праверка праходзіла пры актыўным удзеле з боку радавой партыйнай масы і беспартыйных батракоў і сялян-беднякоў. Кожнаму камуністаму, які праходзіў праверку, давалася аб'ектыўная, усебаковая ацэнка.

Да тых партыйцаў, якія чым-небудзь скампрамэтавалі сябе, камісія і сход падыйшлі сурова.

Вынікі праверкі: **Калінковіч**—сын заможніка—за скрыўленьне клясавай лініі і **Рубенчык**—за бытавое разлажэньне з членаў КП(б)В выключаны.

Некаторыя члены ячэйкі атрымалі вымовы.

М. С.

Праверка ўзмоцніць работу ячэйкі

(Парт'арганізацыя АБВШ)

Закончылася праверка ячэйкі страявое каманды, праверана каля 25 чалавек. Аб тым, наколькі добры склад у данай ячэйцы, гаворыць той факт, што ніводзін партыец пры праверцы ня выключаны з партыі. З усіх праверaных толькі адзін таварыш за ўтойваньне службы ў Чэхаславацкай армії, аб чым перад камісіяй шчыра прызнаўся, атрымаў суровую вымову з напярэджаньнем. Пастаўлена на від аднаму партыйцу за недысцыплінаванасьць.

Вынікі аб рабоце ячэйкі наступныя: ідэалёгічна ячэйка здаровая. Пастановы лістападаўскага пленуму і XVI партыйнай канфэрэнцыі ў асноўным партыйцамі ўцямлены, але ёсьць частка партыйцаў, якая слаба ўсьвядоміла гэтыя пастановы, асабліва сутнасьць правага ўхілу і прымірэнцтва да яго.

Пастановы 12 зьезду КП(б)Б і акруговай партнарады па нац. пытаньні не ўсьвядомлены большай часткай і зусім ня ведаюць аб іх беспартыйныя, таму і наглядаюцца нездаровыя зьявішчы, як выпадкі антысэмітызму і інш.

Па ўсіх гэтых момантах камісія вынесла рад прапаноў і даручыла да 25 жніўня партбюро школы праверыць іх выкананьне.

А. М.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

Не захапляйцеся вузкім культурніцтвам

Не ў парашку „Адоль", а ў тактычнай падрыхтоўцы—галоўны зьмест баявога сацыялістычнага спаборніцтва

5-я стралковая дывізія адзначаецца ад раду іншых дывізій нашае вайскавае акругі тым, што ў ёй з першых крокаў сацыялістычнага спаборніцтва і камандваньне, і палітаддзел дывізіі галоўны ўпор узялі на **баявую падрыхтоўку часьцей.** Аднак, і ў 5-й дывізіі ўсё-ж пытаньні тактычнае падрыхтоўкі дзе-ні-дзе адыходзяць на другі плян, а на галоўнае месца выплываюць зубная шчотка і масельпромаўскі парашок «Адоль».

У часьцях і пададдзелах гэта зьява набывае яшчэ больш яскравую афарбоўку. Ваенком №-скага палка заяўляе:

— Мы мелі некаторы спад энэргіі пасьля заключэньня дагавароў. Дзе-ні-дзе, заключыўшы дагавары і абраўшы штабы, думалі на гэтым супакоіцца. Прыходзіцца зноў разварушыцца, падагараваць застылую ў некаторых таварышоў энэргію.

У роце — у лендоміку, у палатцы яшчэ больш відаць, што справа ня толькі ў застылай энэргіі (энэргія ды ініцыятыва яшчэ ёсьць), а ў тым, што гэта энэргія і ініцыятыва сьцягваюць спаборніцтва з правільнага баявога шляху на шлях вузкага культурніцтва. Вось некалькі фактаў з жыцьця таго-ж №-скага стралковага палка.

У дагаворы 1 і 2 рот пытаньням бытавое культуры выдзелена 6 радкоў, і пытаньні гэтыя канкрэтызаваны, выразна зазначана, што ўсім трэба мець шчотку і парашок, мыцца да пояса, ня курыць, не мацярыцца і г. д. А пытаньням тактычнае падрыхтоўкі выдзелены паўтары радкі агульных фраз: дабіцца маршу 120 крокаў у мінуту і адзнакі «добра».

Пасяджэньне штабу спаборніцтва і роты. На парадку дня — справаздача аб дасягненьнях на культурна-бытавым вучастку спаборніцтва: чыстата ў палатцы, акуратнасьць, запраўка. Таксама — пара слоў аб дысцыпліне. А тактычная падрыхтоўка? Аб ёй яшчэ не рабілі справаздачы і толькі «мяркуюць у далейшым».

Справаздачны сход аб выніках спаборніцтва ў палковай школе. Зноў на першым месцы парашок і зубная шчотка.

У Лендоміку палкавое школы — дошка-справаздача аб ходзе спаборніцтва. Адзнакамі аб культурна-бытавых дасягненьнях запоўнены графы ўсіх аддзелаў. «Выклікаю тав. №-скага купіць зубную шчотку» і тут-жа адказ: «29 чэрвеня шчотка куплена». А графы тактычнае падрыхтоўкі ва ўсіх аддзелах пустыя. Для іх—энэргіі, жвавасьці, выклікаў не хапіла. Зубная шчотка засланіла сабою маскіроўку, дысцыпліну маршу, якасьць работы разьведкі.

І ці не таму на баявым страляньні роты тактычны элемэнт адстаў ад стралковага?

Вывады ясныя! Не захапляйцеся зубным парашком, а стаўце баявую работу, работу байца ў полі на галоўнае месца сацыялістычнага спаборніцтва, на першае месца ў вашых справаздачах, на самае лепшае і віднае месца ў дошцы-справаздачы аб вашай рабоце.

Н.

На палігоне

Зьверху трохі прыпякае сонца Батарэя заняла пазыцыю. З назіральнага пункту відаць цэлі, якія патрэбна абстраляць. Артылерыстыя падрыхтоўваюцца да страляніны. Праз некаторы час батарэя гатова.

З назіральнага пункту на агнявую пазыцыю, па тэлефону перадаецца каманда: «па кавалерыі шрапнэльлю, прыцэл 130, батарэя, агонь!»

На агнявой пазыцыі гэта каманда падаецца гарматнаму разьдзелу. Спакойна, без нэрвовасьці працуе апошні. Шрапнэльны знарад ўжо закладзен у гармату. Гатова!

З моцным гукам «выплёўвае» гармата знарад, які сыпле сноп куль.

За першым ляціць другі, трэці.

У часе перапынку сярод артылерыстых узьнікаюць спрэчкі: «Ці можна ўбачыць знарад у часе палёту» (страялялі з гаўбіц). Пачалі назіраць. Большасьць згаджаецца з тым, што гаўбічны знарад можна ўбачыць пасьля стрэлу.

К канцу страляніна пашла хутчэй. Відаць, што разьдзел ужо мае навык. Няма тэй некаторай марудносьці, якая назіралася ў пачатку страляніны.

Прачышчаны разагрэты, закапцелыя гарматы. Пад'ехаўшыя перадкі ўзялі гарматы, батарэя накіравалася ў лягер.

БРУЯКІН.

Рэкордсмэны з АБВШ

З пераходам школы ў лягэры, пазашкольная праца не вялася, бо ўсе курсанты былі заняты лягерным будаўніцтвам: пабудоваю новых лендомікаў, стаень, студняў і інш.

Арганізаваныя гурткі не працавалі. Аднак, гэта не адбілася на фізычнай падрыхтоўцы курсантаў. Дзякуючы добра пастаўленай працы па фізвыхаваньні яшчэ ўзімку і ў мінулым годзе, курсанты навучыліся ўладаць усімі відамі спорту.

Праведзеныя спартыўныя спаборніцтвы па лёгкай атлётыцы і спартыўных гульнях для выяўленьня лепшых спартсмэнаў школы далі добрыя вынікі.

Па кіданьні гранаты курсант 2-й роты т. **Кулікаў** паставіў усебеларускі рэкорд, кінуўшы гранату на 68 м. і 90 см.

Па бегу на 1.500 м. паставіў усебеларускі рэкорд курсант 3-й роты т. **Ранаўчук,** выканаўшы заданьне за 4 хв. 33 сэк. У мінулым годзе першае месца па бегу на сярэднія дыстанцыі ўзяў у Беларусі курсант 3-й роты т. Лахматкін, а ў гэтым годзе школа дала два рэкордныя месцы. Гэта гаворыць аб тым, што справа фіз. падрыхтоўкі ў АБВШ пастаўлена добра і з кожным годам паляпшаецца.

На акруговым лыжным прабегу, які быў зімою г. г., начальнікі каманд былі з выпускнікоў аб'яднанай беларускай вайсковай школы.

Цяпер, калі пабудова лягераў ужо закончана, пазашкольная праца зноў разгарнулася, працуюць гурткі: футбольны, баскетбольны, валейбольны і г. д.

Р. Пятроўскі.

НОВЫ АТРАД ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ

Сёньня цэнтральныя антырэлігійныя курсы выпускаюць 54 антырэлігійных агітатараў—барацьбітоў з дурманом

Для падрыхтоўкі арганізатараў і кіраўнікоў антырэлігійнай работы цэнтральны савет саюзу валяўнічых бязбожнікаў БССР у пачатку чэрвеня месяца г. г. арганізаваў месячныя цэнтральныя антырэлігійныя курсы, выпуск якіх валяўнічыя бязбожнікі і ўся савецкая грамадзкасьць Беларусі сёньня сьвяткуюць.

Для чытаньня лекцый і вядзеньня лябараторных заняткаў на курсы былі запрошаны лепшыя антырэлігійныя навуковыя сілы: прафэсары Вальфсон, Нікольскі, Усьпенскі, Мрочак, Сянкевіч, Шчапоцьцеў, Белавусаў (ленінградзкі праф.) і інш.

Курсанты праслухалі рад дысцыплін аб гісторыі рэлігіі і клясавай сутнасьці іх, гэтыя дысцыпліны былі прапрацаваны ў лябараторных.

Курсанты працавалі надзвычайна напружана, ні ў адну нядзелю ня было выхадных дзён. Такая напружаная праца была выклікана вельмі малым тэрмінам курсаў—1 месяц, а праграма мінімум 3-х месячная. Так працаваць здолеў толькі той склад, які быў на курсах, гэта ў пераважнасьці рабочыя—актывістыя ад варштату, калгаснікі і сяляне-беднякі і настаўнікі.

Курсы канчаюць 54 чал., з іх 48 мужчын і 6 жанчын. Сярод курсантаў было 35 рабочых ад варштату, 2 калгаснікі, 3 сяляне-беднякі, 3 вясковыя настаўнікі і 11 служачых. 33 курсанты—члены і кандыдаты КП(б)Б, 10 камсамольцаў і 11 беспартыйных.

Паказаны вышэй якасны склад скончыўшых цэнтральныя антырэлігійныя курсы гаворыць аб тым, што сродкі, затрачаныя на курсы, з перавышэньнем будуць апраўданы.

Мы заклікаем усе грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу прафсаюзы і камсамол, аказаць перадавому атраду валяўнічых бязбожнікаў усялякае садзейнічаньне і адпаведную дапамогу ў іх вельмі складанай і цяжкой працы—змаганьні з клясавым ворагам пралетарыяту, які хаваецца пад маскай рэлігіі.

М. ПРАКОФ'ЯЎ.

АНТЫРЭЛІГІЙНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ Ў ШКОЛАХ

Яшчэ дрэнна пастаўлена антырэлігійнае выхаваньне ў большасьці нашых школ. Гэта тлумачыцца часткова тым, што настаўніцтва непадрыхтавана да гэтай работы, часткова і тым, што некаторыя настаўнікі самі не парвалі з рэлігійнымі забабонамі. Слабасьцю антырэлігійнай работы карыстаецца наш вораг, які імкнецца ўплываць на школу.

Антырэлігійнае выхаваньне ў школах павінна стаць адным з самых сур'ёзных задач органаў асьветы. Трэба перападрыхтаваць настаўнікоў, каб яны маглі заўсёды даць адказ на запытаньні вучня наконт рэлігійных забабон.

Як-жа павінна быць пастаўлена антырэлігійная праца ў школе? Мэтады і формы працы перш за ўсё павінны быць разнастойныя. Трэба адмовіцца ад дакладамі і лекцыямі, якія ў большасьці сваёй носяць кампанейскі характар і бываюць далёка непадрыхтаванымі. Даклады і лекцыі і гутаркі павінны быць аднэй з частак усей разнастойнай антырэлігійнай працы.

У школе павінна быць арганізавана ячэйка «Бязбожнік», якая ахопіць усё вучнеўства. Пры кожнай школе трэба арганізаваць антырэлігійны куток, у якім будзе сканцэнтравана антырэлігійная праца вучняў. Трэба праводзіць плянавыя сыстэматычныя, антырэлігійныя вечары, якія павінны быць дасканала падрыхтаваны. Праграма вечару павінна быць па зьмесьце антырэлігійная, а па форме разнастойная, як невялічкі даклад на антырэлігійную тэму, п'еска, дэклямацыі, частушкі, хор і г. д.

Карэнны пералом у антырэлігійным выхаваньні ў школе можна зрабіць канчаткова тады, калі гэтая праца стане арганічнай часткай школьнай работы. Лёзунг сёньняшняга дня «безрэлігійнае выхаваньне ў школе» замяніць антырэлігійным.

С. К.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ БЯЗБОЖНІКА

Сучасны пэрыяд патрабуе ад усіх працоўных краіны напружанай работы, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі, па рэканструкцыі ўсёй гаспадаркі, выкананьня пяцігодкі па зьнішчэньні цемры, пякультурнасьці—асноўных ворагаў новага ладу. Яшчэ глыбока сядзяць карані спадчыны мінулага--рэлігійны дурман і пякультурнасьць.

Рэлігійнікі ўсіх масьцей, за сьпіной якіх хаваецца наш клясавы вораг, імкнуцца ўсялякімі спосабамі падарваць гэтую вялікую працу па пабудове сацыялізму.

Мы ня можам ні ў якім разе дапусьціць цярпімасьці да дзейнасьці клерыкалаў. **Зараз патрэбны карэнны пералом у антырэлігійнай працы. Трэба пачаць рашучае наступленьне па усім антырэлігійным фронце, мабілізаваць шырокія колы савецкай грамадзкасьці, каб вымесьці рэлігійныя забабоны ў сьмяцьцёвую яму гісторыі.**

Для правядзеньня гэтай работы патрэбны падрыхтаваныя т. т., якія-б кіравалі антырэлігійнай работай. Іх даўць антырэлігійныя курсы.

Валяўнічы атрад бязбожнікаў скончыўшых цэнтральн. антырэлігійныя курсы, праз некалькі дзён разьедзецца ў розныя куткі Беларусі, каб уступіць у бой з векавым злом пралетарыяту—рэлігіяй. Пры дапамозе савецкай грамадзкасьці яны выканаюць свае задачы.

Кунаўскі

За выразнае выкананьне партыйных дырэктыў

Пастанова ЦК КП(б)Б аб выкананьні Магілеўскім АК дырэктыў ЦК ад 3-III 1928 г.

1. Заслухаўшы даклад сакратара Магілеўскага АК тав. **Нэйланда** і судаклад адказнага інструктара ЦК тав. **Ваўковіча** аб выкананьні дырэктыў, ЦК канстатуе: ня гледзячы на тое, што ЦК вынес пастановы больш году таму назад, АК зрабіў толькі першыя крокі па шляху выкананьня дырэктыў ЦК; значная частка практычных указаньняў ЦК ня выканана.

2. ЦК адзначае, што пастановы ЦК слаба растлумачаны ў ячэйках і недастаткова мабілізавана ўвага апошніх для правядзеньня іх у жыцьцё.

3. АК недастаткова правёў у жыцьцё дырэктывы ЦК аб паляпшэньні партыйнай і прафэсыянальнай работы на прадпрыемствах «Спартак» і «Ільліч» на грунце ўсебаковага ўзмацненьня работы ў цэху, выхаваньня і згуртаваньня партыйнага актыву і наладжаньня работы групоргаў і цэхоргаў, у зьвязку з чым прыкметных паляпшэньняў у гэтым напрамку няма; правы хвасьцізму з боку нізавых партыйных і прафэсыянальных арганізацый, прымірэнчыя адносіны да праяў антысэмітызму і шкодніцтва, а таксама ня было рашучай барацьбы з гэтымі зьявішчамі. Недастатковае выхаваньне і ўцягненьне ў практычную работу камуністых Кастрычнікаўскага закліку, галоўным чынам, і нядаважлівыя адносіны пры прыёме павялі да выхаду некаторай часткі з партыі. АК ня выканаў гэтую дырэктыву з прычыны таго, што **бюракратычна падыйшоў да кіраўніцтва** парткалектывамі гэтых прадпрыемстваў. Заслухаўшы даклад партколектыву, прызнаўшы іх работу незадавальняючай і зьняўшы сакратароў парткалектываў з працы, АК нічога не зрабіў, каб мабілізаваць увагу партарганізацыі вакол асноўных недахопаў работы і жыцьця прадпрыемстваў, дырэктывы АК ня былі дастаткова прыстасаваны да спэцыфічных умоў (адлегласьць ад цэнтраў, уплыў вёскі, многія рабочыя маюць сваю гаспадарку і жывуць у вёсцы і г. д.). А галоўнае, што партарганізацыя аб пастановах АК ня ведала, нават рэвалюцыі АК ў ячэйцы «Спартак» не аказалася.

Дырэктыва ЦК аб разгортваньні работы па барацьбе з праявамі антысэмітызму не знайшла свайго канкрэтнага праламленьня да таго, пакуль на «Спартаку» і «Ільлічы» ня здарыліся абурачыя выпадкі антысэмітызму. Па дакладах парткалектываў гэтых прадпрыемстваў гэтае пытаньне завострана ня было.

Улічваючы асаблівасьці гэтых прадпрыемстваў, АК неабходна разам з арганізацыйным узмацненьнем работы ў цэху, групоргаў, цэхоргаў і зьменоргаў, таксама налепшыць і якасьць работы па сацыялістычным спаборніцтве, асабліва ўнутры самога прадпрыемства (паміж цэхамі, паасобнымі групамі і г. д.), зьмест усёй работы як у партарганізацыі, так і сярод рабочых накіраваць, **каб разьвіваць рэвалюцыйную пільнасьць рабочых, навучыць рабочых разумець асобныя формы клясавай барацьбы цяперашняга пэрыяду (антысэмітызм, шкодніцтва і г. д.). Канкрэтныя, часамі дробныя** пытаньні, адносін да працы і да вытворчасьці неабходна надымаць на палітычную вышыню і на гэтых живых фактах жыцьця прадпрыемства, на посьпехах і недахопах выхоўваць клясавую сьвядомасьць рабочых, даючы адпор правам групавых і цэхавых інтарэсаў пасобных груп рабочых. Партмасавую работу будаваць так, каб максымальна набліжыць яе да цэху, да паасобнага рабочага: вечары пытаньняў і адказаў, гутаркі ў цэхах, інтэрнатах рабочых пасёлкаў, на вёсцы з кампактнымі масамі жывучых там рабочых, дабіцца большага прыцягненьня партыйнага актыву да штодзённай агітацыйнай работы сярод рабочых.

4. Адным з буйнейшых недахопаў працы АК зьяўляецца недастатковая ўвага і кантроль за сацыяльным напрамкам крэдыту, дзякуючы чаму заможнік і кулак у 1928 годзе карысталіся значнай доляй крэдытаў (7,1 проц.). На машыны ад паасобных таварыстваў заможнік і кулак атрымлівалі да 16,5 проц.

ЦК прапануе АК канчаткова спыніць крэдытаваньне заможных і кулакоў. Зрабіць праверку сацыяльнага напрамку крэдытаў у 1929 г., завастрэйшы вакол гэтага пытаньня ўвагу ўсёй партарганізацыі і арганізаваць сталы кантроль груп беднаты за разьмеркаваньнем крэдыту.

Адзначаючы ў рабоце АК некаторыя посьпехі ў разьвіцьці калгаснага будаўніцтва, значнае скарачэньне хутарской формы зямлякарыстаньня, павялічэньне трасаваньня і некаторае павялічэньне засеву тэхнічных культур, разам з гэтым ЦК адзначае, што слабасьць работы па падняцьці ўраджайнасьці і таварнасьці сельскае гаспадаркі ў значнай меры тлумачыцца недастатковым тэмпам пераходу на шматпольле (34 проц. да зямляўпраждаванай плошчы). Калгаснае будаўніцтва ідзе ў большасьці па шляху дробных аб'яднаньняў. АК не дабіўся, каб выканаць дырэктыву ЦК аб узбуйненьні існуючых калгасаў.

Пытаньні ўзмацненьня тэмпу пераходу на шматпольле, кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам вытворчым каапэраваньнем, узмацненьне работы па кантрактацыі, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі і саўгасамі, паасобнымі вёскамі, узбуйненьне і ўзмацненьне існуючых калгасаў—вясковыя партарганізацыі павінны паставіць на першы плян. Скарыстаць, як апорныя пункты масавай работы на вёсцы, калгасы і саўгасы, арганізуючы пры іх хаты-чытальні, чырвоныя куткі, вытворчыя канфэрэнцыі і выстаўкі і г. д.

5. Ня выканаты дырэктывы ЦК аб рашучым пераломе па ўцягненьні ў партыю батракоў і с.-г. рабочых, у выніку гэтага, а таксама недастатковай работы партарганізацыі ў вёсцы, удзельная вага батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых. Прыняць рашучыя меры па ўцягненьні камуністых у калгасы.

Паказваючы на наяўнасьць праяўленьня ў практычнай рабоце некаторых парт'ячэек і паасобных партыйцаў, асабліва на вёсцы, правага ўхілу і прымірэнчых адносін да яго (арошчваньне з заможнікамі, крэдытаваньне заможных, высоўваньне кулакоў у сьпіс ячэек, ігнараваньне калектывізацыі), ЦК прапануе акругкому ўзмацніць барацьбу з праявамі правага ўхілу ў практычнай рабоце і больш растлумачыць сярод партыйнай арганізацыі пытаньне аб асноўных крыніцах і сутнасьць правага ўхілу.

6. Ня выканана таксама дырэктыва ЦК аб ужыцьці рашучых мер да арганізацыі новых груп беднаты пры сельсаветах і каапэрацыі, а таксама ўцягненьня батрацтва ва ўсе віды работы з беднатой, у выніку чаго, ня гледзячы на некаторы рост груп, работа іх надгрупы амаль не працавалі, і ніякага ўплыву на работу ўстаноў і арганізацыі ня было. Зусім мала ўцягнута батракоў у работу груп. АК трэба прыняць меры да арганізацыі груп пры ўсіх сельсаветах, КСУ і каапэрацыі, забясьпечваючы іх парткіраўніцтвам і каб забясьпечыць стварэньне з беднапоры ў правядзеньні палітыкі партыі на вёсцы.

7. Дырэктывы ЦК аб рашучым пераломе па ўцягненьні ў партыю батракоў і с.-г. рабочых, каластыя элемэнты, ЦК прапануе АК ў найкарацейшы тэрмін правесьці неабходныя мерапрыемствы па ўзмацненьні тэмпу ўцягненьня ў партыю

АПАРАТ—ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС

ШТО ДАЎ АГЛЯД НАРКАМФІНУ

Выяўлена магчымасьць значна спрасьціць структуру апарату і скараціць штаты.—Камісія па аглядзе не знайшла ніводнага вылучэнца-рабочага.—Затое знойдзена шмат фактаў бюракратызму і цяганіны

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ЗРОБІЦЬ НАЛЕЖНЫЯ ВЫВАДЫ

(ГУТАРКА З СТАРШЫНЁЙ КАМІСІІ ПА АГЛЯДЗЕ І ЧЫСТЦЫ НКФ тав. ЭПШТЭЙНАМ)

У гутарцы з нашым супрацоўнікам па пытаньні агляду і чысткі апарату Наркамфіну старшыня камісіі т. **Эпштэйн** паведаміў наступнае:

— За апошнія гады Наркамфін мае рад дасягненьняў у галіне рацыяналізацыі, спрашчэньня структуры, паляпшэньня якасьці работы і скарачэньня штату. Але-ж гэтага мала. Пры аглядзе работы ўстановы выкрыты і буйныя недахопы ў працы Наркамфіну.

Так, у галіне структуры НКФ ёсьць роўнадзежнасьць у рабоце паміж паасобнымі кіраўніцтвамі. Напрыклад, абсьледваньне **Белдзяржкіно** праводзілі два кіраўніцтвы: кантрольнае і дзяржпрыбыткаў. Гэтыя кіраўніцтвы паасобку пасылалі сваіх інструктароў, у выніку чаго атрымаўся такі малюнак: інспэктар па лініі фінкантролю ў сваіх вывадах піша, што фінансавае становішча Белдзяржкіно **напружанае**, а інспэктар дзяржпрыбыткаў у сваіх вывадах піша зусім іншае, што фінансавае становішча Белдзяржкіно **спрыяючае**. Каму-ж верыць у такім выпадку? Невядома.

Справаводства і статыстыка распылены па паасобных кіраўніцтвах. Замест сакратарыяту, які існуе ў іншых наркаматах, у НКФ існуе цэлае кіраўніцтва пад назвай «адміністрацыйна-арганізацыйнае кіраўніцтва».

У сувязі з гэтым у часе агляду ўнесены наступныя прапановы: аб'яднаць кіраўніцтва дзяржпрыбыткаў з бюджэтным таму, што ў іх рабоце наглядаецца вялікая роўнадзежнасьць. Прынята таксама пастанова аб ліквідацыі бюджэтнай нарады таму, што яна зьяўляецца лішняй інстанцыяй для разгляду каштарысаў. З ліквідацыяй бюджэтнай нарады, акрамя эканоміі службовага часу, які ідзе на пасяджэньні, адпадае рад работ, якія звычайна праводзяцца: падрыхтоўка ў друкаваным відзе і ў вялікім ліку экземпляраў розных табліц, зводак, заключэньняў па каштарысах складаньня, друкаваньня і рассылкі пратаколаў пасяджэньняў і г. д.

Вырашана ліквідаваць адміністрацыйна-арганізацыйнае кіраўніцтва, а замест яго арганізаваць сакратарыят, у якім будзе сканцэнтравана ўсё справаводства. Статыстыка канцэнтруецца ў адным месцы—пры плянава-эканамічным бюро з тым, каб увесь апарат мог карыстацца лічбамі з аднаго месца. **Гэтыя мерапрыемствы ўводзяцца з 1-га кастрычніка і ўжо ўзгоднены з адміністрацыяй, мясцкомам і грамадзкімі арганізацыямі.**

Акрамя таго, што гэта павінна палепшыць самую працу, ліквідуецца роўнаважнасьць... а гэта дасьць магчымасьць скараціць штаты.

Але гэта работа па рацыяналізацыі зьяўляецца яшчэ не канчатковай і пытаньне аб пераходзе НКФ на функцыянальную сыстэму (канчаткова ліквідацыя кіраўніцтва), распрацаванае эканомкамісіяй, перадаецца, як матар'ял для далейшага вывучэньня НКРСІ.

Зараз паглядзім, як стаіць справа з вылучэньнем у НКФ?

Справа з вылучэньнем у НКФ і наогул з арабочаньнем апарату стаіць надзвычайна дрэнна. Апарат сам па сабе вялікі, але ў ім няма **ніводнага вылучэнца рабочага.**

Два вылучэньцы члены ЦВК—сяляне апынуліся ў апараце НКФ толькі таму, што іх «накіравалі». Аднаму з іх т. Самахвалай не дапамагалі, не зьвярталі на яе ніякае ўвагі і наогул ня цікавіліся яе работай.

— Я паставіла пытаньне—кажа тав. Самахвалава,—каб мяне паслалі ў камандыроўку па вучоце аб'ектаў апаткаваньня. Але атрымала такі адказ ад наркома т. **Мікуліча:** «няма сэнсу пасылаць». У той час, як у адну і тую-ж акругу пасылалі двох працаўнікоў.

Разам з гэтым адсутнічае якая-б там ні было сувязь з масамі. У некаторых працаўнікоў склалася такая думка, што НКФ такі апарат, які ня можа трымаць сувязь з масамі. Рабочая брыгада заявіла, што ня можа быць такой установы ў Савецкім Саюзе, якая-б ня мела сувязі з масай.

— Якую-ж сувязь мы будзем трымаць з масай?—пытаецца адміністрацыя.

— Прыходзьце да нас на завод,—кажа рабочы **Марголін,—і** растлумачце рабочым аб падаходным прыбытку, рэнце і г. д.—і вы знойдзеце шмат ўважлівых слухачоў...

Не апошняе месца ў працы НКФ займае цяганіна. НКФ—такая ўстанова, куды паступае шмат праектаў законадаўчага парадку ад урадавых і іншых устаноў. Між тым, гэта справа ў НКФ зусім не наладжана. Камісія выкрыла цэлы рад фактаў, калі праекты ў НКФ затрымліваюцца на цэлыя месяцы замест таго, каб гэта было вырашана ў тыдзень. Так, адзін абежнік пасьля подпісу яго праляжаў у выканаўцы падатковага кіраўніцтва...**9 месяцаў.** Другі прыклад, 27 кастрычніка 1928 г. кіраўніцтва дзяржпрыбыткамі атрымала з НКФ СССР адносіну даць у тэрміновым парадку весткі аб удзеле мясцовых сродкаў у электрабудаўніцтве. Праз 2 з пал. месяцы кіраўніцтва атрымала напамінак. Пасьля напамінку праз два месяцы далі адказ. Вось дык тэрміновасьць!

Такіх фактаў у НКФ надзвычайна шмат.

Камісіяй выкрыта яшчэ адна хвароба —затрыманьне з подпісам папер. Гэта асабліва мела месца ў бюджэтным кіраўніцтве ў т. т. Сьцепанюка і Татура, калі паперы **не падпісваліся** па дваты тыдні. Затрымліваліся таксама паперы на подпісе ў наркома і яго намесьніка.

У выканаўцаў-інспэктароў паперы затрымліваліся па 10—12 дзён, калі справа была некалькіх хвілін.

Брыгада, па аглядзе працы апарату ўнесла рад прапаноў: так, у падатковым кіраўніцтве паскорыць разгляд скаргаў. На эканомнарадзе прынята пастанова аб ліквідацыі раённых падатковых камісій. Прызнана неабходным вызваліцца ад «штампоўкі» ўсіх скаргаў вышэйшай адміністрацыі, а толькі абмежавацца подпісам начальніка кіраўніцтва.

Брыгада таксама зазначыла, што па віне НКФ СССР і БССР няправільна абкладаюцца папы, рабіны, якія аднесены да 2-га разраду наравні з саматужнікамі, якія маюць двох рабочых.

Сучаснае становішча дзяржфінкантролю як па тых правох, якія ён мае, так і па мэтадах яго работы не адпавядае нашым запатрабаваньням. Брыгада лічыць, што трэба паставіць пытаньне аб мэтазгоднасьці, ці існаваньня **дзяржфінкантролю пры НКФ.** Але гэта пытаньне патрабуе вывучэньня. Даручана эканомкамісіі і рацыяналізатарскаму бюро па працягу 2-х месяцаў вывучыць гэта пытаньне.

Устаноўлена, што па бюджэтным кіраўніцтве ёсьць рад недахопаў у прахаджэньні бюджэтаў—яны праходзяць шмат інстанцый. Акрамя таго ўстаноўлена, што няма належнай увязкі паміж НКФ і работай другіх наркаматаў, якія зьвязаны з работай па бюджэце (НК РСІ па ўстанаўленьні штату, Наркампрацы па ўстанаўленьні ставак, Дзяржплян па дачы заключэньняў па бюджэтах). Нават і ў гэтым годзе штаты і стаўкі зацьверджаны з вялікім спазьненьнем.

Вынікі камісіі па прынцыповых пытаньнях абгаворваліся 5 ліпеня на эканомнарадзе, дзе амаль прысутнічалі ўсе супрацоўнікі. Амаль што па ўсіх прынцыповых пытаньнях у брыгады няма разыходжаньняў з думкаю ўсіх грамадзкіх арганізацый НКФ.

Вялікую працу і дапамогу брыгадзе аказала насьценгазэта, якая выпусьціла некалькі нумароў па аглядзе працы.

10 ліпеня ў клюбе саўгандальслужачых пачнецца непасрэдная работа па чыстцы.

Чыстка банкаўскіх устаноў

Крэдытная сыстэма зьяўляецца магутнай зброяй дапамогі разьвіцьцю нашае сацыялістычнае гаспадаркі.

Тэмп росту нашае гаспадаркі зьвязан з работай нашых банкаў вельмі шчыльна. Таму выразнасьць і актыўнасьць у рабоце крэдытных устаноў павінна быць забясьпечана поўнасьцю.

Выкананьне 5-гадовага пляну патрабуе вялізнай мабілізацыі сродкаў. У сувязі з гэтым пытаньне аб разьвіцьці фондавае і ашчаднае справы, пытаньне аб уцягненьні зьбераженьняў дзесяткаў мільёнаў рабочых і селян у рэчышча дзяржаўнага крэдыту набывае першаступяпёвае значэньне.

Таму мы павінны ўкамплектаваць банкаўскі апарат такім кадрам працаўнікоў, якія маглі-б стаць самымі актыўнымі агітатарамі за зьбераженьні, за дзяржпазыкі—сапраўднымі арганізатарамі гэтае важнейшае справы як у вёсцы, так і ў горадзе.

Таму мы павінны ўсякаму разгільдзяйству ў рабоце паасобных супрацоўнікаў нашых банкаў абвясьціць сапраўдную вайну.

Вынікі работы нашых гаспадарчых арганізацый выяўляюцца: у разьлічках, вэксалёх, крэдытах—фінансавым стане гаспадарчых арганізацый.

Калі даны трэст, або даны канцэрнтыў кепска гаспадарыць, дырэктывы ўраду выконвае няправільна, дык гэта няўхільна адаб'ецца на яго фінансавым стане. І банкі, якія зьвязаны з кліентам штодзённай работай, вельмі хутка гэта адчуюць.

Пры такіх умовах абавязкам адпаведных банкаўскіх работнікаў зьяўляецца не пасыўны і фармальны, як гэта часта бывае, «нагляд» за станам справ кліентуры, а наадварот—**самая актыўная сыгналізацыя ўраду аб заўважаных нездаровых зьявах у гаспадарцы і самае рашучае ўзьдзейнічаньне для правільнага выкананьня гаспадарчымі органамі дырэктыў нашага ўраду.**

У адпаведнасьці з гэтым мы павінны патрабаваць ад працаўнікоў банку не фармальных, а сьвядомых і ўдумлівых адносін да сваёй работы і работы банкоўскае кліентуры.

Было-б памылкова падыходзіць з агульным недавер'ем да складу старых спэцыялістых, якія працуюць у нашых установах.

Зусім бясспрэчна, што ў складзе нашых банкаў мы маем значную колькасьць старых спэцыялістых, якія добрасумленна і самааддана выконваюць свае абавязкі. Але побач з гэтым нам часта даводзіцца сустракацца з такімі зьявамі, калі некаторыя старыя банкаўскія спэцыялістыя не разумеюць, не ўсьведамляюць тых задач, якія ляжаць на савецкім банку ў адрозьненьне аб банку капіталістычнага.

Таму адначасова са скарыстаньнем нашых старых спэцыялістых — арабочаньне банкаўскага апарату, **рашучае вылучэньне новых маладых кадраў банкаўскіх работнікаў** асабліва патрэбна для таго, каб банкі сапраўды маглі з посьпехам справіцца з тымі вялізнымі задачамі, якія ставіць перад імі разьвіцьцё нашае сацыялістычнае гаспадаркі.

Дзе-ж пралетарскае чуцьцё?

Адзначальная рыса савецкага чыноўніка—ня бачыць за літарай закону жывых. Для такога працаўніка ў футарале ўсякае здавальненьне просьбы, адмаўленьне і г. д. грунтуецца выключна на тым ці іншым параграфе. Аб клясавым падыходзе, тут, зразумела, гутаркі быць ня можа.

Вось, напрыклад, інспэктарыят па прампадатку НКФ БССР. На стале ўсе законы, інструкцыі і тлумачэньні, усё падшыта, усё на месцы.

Пачынаецца гарачы час прампадатковага абкладаньня. Дзесяткамі паступаюць скаргі ад дзяржаўных, каапэратыўных і прыватных асоб. Аднаго пераабклаялі, у другога няправільна вылічыла звароты і г. д. Зьбіраюцца пры кожнай скарзе груды запытаньняў, заключэньняў і толькі праз 5-6 месяцаў часамі даецца канчатковы адказ, пры тым досыць лякانічны: «На падставе такога і такога артыкулу скарга адхіляецца», або «адхіляецца для новага разгляду».

Ва ўсіх гэтых адказах адчуваецца толькі фармальны падыход, падмацаваны патрабаваньнем ад нізавых фінорганаў паперак, даведак, што той ці іншы скупшчык (нэпман, спэкулянт) прадаў тэй ці іншай установе або прыватнай асобе. І гора таму фініспэктару, які не забясьпечыцца выпіскамі на ўсе 100 проц. абкладаемага звароту. Прампадатковая інспэктура, не ўваходзячы ў разгляд справы па сутнасьці, па фармальных матывах (так і пішацца) адмяніць пастанову фініспэктара, або прымусіць яго аб'ехаць ледзь ня ўвесь СССР, праверыць, ці няма ў якой установе ці прадпрыемстве ліцавога рахунку такога дастаўшчыка.

Вось, напрыклад, справа дастаўшчыка каменьня Лапірава. Гомельскі акрфа, вывіўшы, што ён даставіў Гомельскаму камгасу на 62.000 руб. каменьняў, улічвае гэта і робіць палічэньне ў 20 проц. на няўлічаныя звароты, маючы даныя, што азначаны дастаўшчык прадаваў яшчэ прыватным і інш. установам. Лапіраў, маючы салідна набітую кішэню, наймае самага лепшага гаваруна і пісаку і пачынае пісаць ва ўсе інстанцыі БССР і нават у ЦВК, што яго беднята пакрыўдзілі, парушылі ў адносінах яго рэвалюцыйную законнасьць. Усе ўстановы аднесьліся да яго скаргі ня так мякка, як Наркамфін і асабліва прампадатковая інспэктура. Убачыўшы ў Лапірава чалавека, які ведае законы, падатковая інспэктура становіцца ў яго абарону і дае тэрміновую тэлеграму Гомельскаму акрфа спыніць продаж 2-хпавярховага дому Лапірава, бо... парушана рэвалюцыйная законнасьць, няма ўсіх даведак і выпісак на абложаную суму. Лапіраў задаволены. Знайшліся такі і ў савецкіх органах людзі, яія спачуваюць яму. Але Гомельскім фініспэктарам ня сьпіца. Тэрміновыя запытаньні ва ўсе ўстановы Гомельскае акругі, заўважце, пакуль што толькі Гомельскай і, о, дзіваў, у Рэчыцкім камгасе таксама знайшлі яго дастаўку на большую суму, чым меркавалі.

Не адыходзячы ад свайго прынцыпу —больш верыць нэпманам-скаргаўшчыкам, чым сваім нізавым прафоргранам, прампадатковая інспэктура ня спыняе свае палітыкі і ў справе буйнога скупшчыка фруктоўшчыка Воласава, які спрытна ўвільваў на працягу доўгага часу ад фінорганаў і толькі тады, калі яго зловілі ў канцы 1928 г. і згодна розных дакумантаў устанавілі, што ён робіць буйныя апэрацыі па скупцы і продажы фруктаў, яму было запрапанавана ўзяць патэнт.

Віцебскі акрфа, атрымаўшы частку дакумантальных даных аб яго апэрацыях, вызначае суму звароту за ўвесь 1928 г. Але Воласаў таксама, як і Лапіраў, наймае добрага юрыстага і даводзіць Наркамфіну, што ў адносінах яго парушылі закон. Бачыце, калі палатак браць, дык толькі за той пэрыяд, за які выбран патэнт і калі фініспэктар не дагледзеў, дык ня Воласава віна. Зноў прампадатковыя працаўнікі становяцца на бок «пакрыўджанага» і скасоўваюць пастанову акрфа аб продажы дому.

Дзе-ж было пралетарскае чуцьцё працаўнікоў Наркамфіну пры правядзеньні адной з важнейшых дырэктыў партыі—рашучага наступленьня на нэпманскія элемэнты, якія так умела ашукваюць дзяржорганы?

БРЫГАДЗІР.

Ад камісіі па чыстцы НКФ

Сёньня, 9-га ліпеня, а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе саўгандальслужачых адбудзецца агульны сход супрацоўнікоў Наркамфіну **сумесна з рабочымі заводаў «Бальшавік» і «Камунар».**

Парадак дня:

Даклад наркамфіна і судаклад рабочай брыгады па аглядзе ўстановы ў сувязі з чысткай.

Чыстка Наркамфіну пачынаецца **10-га ліпеня** а 6 гадзіне ўвечары і будзе праходзіць **ў клюбе саўгандальслужачых.**

Запрашаюцца да актыўнага ўдзелу ў чыстцы ўсе жадаючыя рабочыя, служачыя і сяляне.

Камісія па чыстцы канчаткова зацьверджана ў наступным складзе:

1. **Эпштэйн** (Наркампрацы)—старшыня камісіі.
2. **Шунэйка**—рабочы зав. «Энэргія».
3. **Лупач**—рабочы зав. «Дрэваапрацоўшчык».
4. **Рашчынскі**—прадстаўнік мясцкому НКФ.
5. **Бунін**—прадстаўнік адміністрацыі НКФ.

Камісія па чыстцы Наркамфіну.

„Актывістыя" з вышэйшай адукацыяй

Азнаёміўшыся з працай грамадзкіх арганізацый, існуючых пры Наркамфіне, можна ўбачыць, што большасьць іх працуе здавальняюча, а некаторыя—нават і вельмі добра.

Аднак, трэба прызнаць, што пры тых магчымасьцях, якія ёсьць у Наркамфіне, можна было-б яшчэ лепш паставіць грамадзкую працу і яшчэ глыбей правесьці рацыяналізацыю апарату.

У складзе Наркамфіну значны процант падае на людзей з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Напрыклад, з агульнага ліку служачых у 122 асобы—25 асоб, або 20,66%—з вышэйшай адукацыяй, 44 асобы ці 36,26%—з сярэдняй.

У сучасны момант у розную грамадзкую працу (за выключэньнем удзелу ў рабкораўскай працы)—уцягнуты 82 асобы, або 67,2% агульнага ліку служачых. Здавалася-б, што калі толькі 40 асоб ня прымаюць удзелу ў грамадзкай працы, то гэта ня вельмі шкодна, але калі пацікавіцца, хто іменна ўваходзіць у лік гэтых 40 асоб, выяўляецца, што значны процант ня прымаючых удзелу ў грамадзкай працы падае на людзей **з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.**

У свой час гэты факт асьвятляўся на старонках насьценгазэты. Там адзначалася, што цэлы рад таварышоў, як напрыклад, Рэйхэрт, Рытэнбанд, Завусьцінскі, Кірык, Паллан, Плоцкі, Штэйнэр, Панерджы, Угнявёнак і іншыя (якія атрымалі вышэйшую адукацыю) ніякага ўдзелу ў грамадзкай працы НКФ ня прымаюць.

Характэрна адзначыць, што большасьць таварышоў, даючы адказ на заўвагі, зробленыя адносна іх у насьценгазэце, далі чыста фармальны адказ.

Узяць кантралёра дзяржфінкантролю тав. **Паллана.** Малады, працаздольны, да рэчы кажучы, ня надта перагружаны па сваёй службовай працы. Здавалася-б, што яму толькі і прымаць удзел у грамадзкіх арганізацыях.

Але, бачыце, ён лічыць, што выконваючы абавязкі зборшчыка членскіх узносаў па сваім кіраўніцтве і члена рэвізійнай камісіі шэфтаварыства—гэта зусім дастатковая грамадзкая нагрузка. Праўда, т. Паллан піша далей у сваім адказе, што «даручана (старшыні эканомкамісіі) мець на ўвазе яго (Паллана) кандыдатуру па разгортваньні с[illegible]лістычнага спаборніцтва».

Трэба ўнесьці яснасьць і сказаць, што т. Паллан залічан у «кандыдаты» на актывістага толькі пасьля таго, як у насьценгазэце адзначылі яго пасыўнасьць у грамадзкай працы.

Бухгальтар-інспэктар т. **Рэйхэрт,** якога можна ахарактарызаваць, як актыўнага працаўніка грамадзкай працы і слабога наведвальніка нават агульных сходаў — гэты дае наступнае клясычнае апраўданьне сваёй пасыўнасьці: «нельга таварышом, якія працуюць ва ўстанове і адначасова вучацца ва універсытэце, рабіць дакор, што яны ўхіляюцца ад грамадзкай працы». Разам з гэтым т. Рэйхэрт спасылаецца на тое, што ён мае значную нагрузку па інстытуце дзяржаўных бухгальтароў-экспэртаў.

Эканамісты т. Штэйнэр хоча перакапаць нас у тым, што калі ў апошні час ён прымаў удзел у адной часовай камісіі, то гэта дае яму права лічыць сябе ня толькі «кандыдатам у актывістыя», як т. Паллан, а нават сталым стопроцантным актывістым.

Галоўны бухгальтар т. **Угнявёнак,** аб якім мы таксама казалі вышэй—гэта вельмі «перагружаны» чалавек, бо, бачыце, прышоўшы на працу, яму трэба перачытаць усе мясцовыя і цэнтральныя газэты. Гэта так шмат адбірае ў яго часу, што нават адказ у насьценгазэту ён ня меў магчымасьці напісаць сваёй уласнай рукой, а гэта зрабіў за яго намесьнік ст. бухгальтар Шатэрнік.

У сваім адказе (напісаным чужымі рукамі) т. Угнявёнак кажа, што ён мае значную нагрузку па лініі мясцовага камітэту. Але нам вядома, што гэта выпадковыя даручэньні па асобных пытаньнях. Далей, таксама, як і т. Рэйхэрт, т. Угнявёнак напірае на тое, што ён вельмі шмат аддае часу «грамадзкай працы» ў якасьці дзяржаўнага бухгальтара-экспэрта.

Мы ведаем, што т.т. Угнявёнак і Рэйхэрт сапраўды маюць значную нагрузку, як бухгальтары-экспэрты, але яны забылі ў сваіх адказах адзначыць, што гэтых «нагрузак» яны не баяцца, бо за кожную экспэртызу атрымліваюць асобную плату.

Мы ня ставім пытаньня так, што актыўнасьцю можа прызнавацца толькі ўдзел у складзе якой-небудзь камісіі, або ў наведваньні пасяджэньняў.

Можна, ня робячы ні тэзы ні другога, прынесьці значную карысьць, праз падачу прапаноў аб рацыяналізацыі працы, зьмены структуры, па скарачэньні выдаткаў і г. д.

Поле для грамадзкай працы ў НКФ вельмі вялікае. Таму ў часе наверкі апарату, нельга не зьвярнуць увагі на тое, што на другім 10-цігоддзьдзі рэвалюцыі знаходзяцца людзі, якія ніяк ня хочуць уявіць сабе, што яны ня маюць права заставацца старонньмі глядачамі справы сацыялістычнага будаўніцтва.

ВОКА.

Хіба з імі можна будаваць сацыялізм?

(Некалькі заўваг да чысткі Дзяржбанку)

У нядзельным нумары «Зьвязды» зьмешчаны тры артыкулы пад агульным загалоўкам—«Па ўхабах Дзяржбанку», да рэчы сказаць, вельмі ўдалым, які малюе перад чытачом горы і нізіны, праз якія Дзяржбанку трэба пераяжджаць у сваёй рабоце.

Два артыкулы гавораць аб фактах бюракратызму, цяганіны, нядбайнасьці некаторых супрацоўнікаў, трэці—намячае шляхі карэннае рэарганізацыі банкаўскае сыстэмы. І вось, калі падумаеш пра вялікія задачы, што стаяць у пэрспэктыве банку і паглядзіш на людзкі пэрсанал, з якім прыдзецца гэтыя задачы вырашаць, мімаволі задаеш сабе пытаньне: **ды хіба з гэтымі працаўнікамі можна праводзіць рэарганізацыю?** Хіба гэтыя працаўнікі дапамогуць нам будаваць новы апарат, апарат патрэбны рабочай клясе для будаўніцтва сацыялізму?

Каб даць больш дакладны адказ на гэта запытаньне, паглядзім, **хто** сядзіць у нас, у Дзяржбанку, **каму** давярае рабочая кляса народныя каштоўнасьці, **на каго** яна ўскладае вялікія надзеі на ўзмацненьні нашае гаспадаркі.

Пачнем з галоўбуха **Конюха.** Хто ён? У мінулым—стацкі дарадца, таварыш кіраўніка царскім дзяржаўным банкам. Жыў некалі ня дрэнна, атрымліваў за шчыруючую службу добрую пэнсію, якая ня толькі давала яму магчымасьць пырока жыць, але будаваць сабе дамы. Рэвалюцыя пазбавіла яго сытага жыцьця і Конюх пачаў «прыстасоўвацца». Ён пашоў «служыць» бальшавіком. Нічэга ня зробіш. Піць і есьці трэба.

І «служыць» Конюх галоўбухам. «Служыць» неахвотна, як сапраўдны стары чыноўнік.

Папярэднік Конюха кожны месяц правяраў банкаўскія кнігі, Конюх лічыць гэту работу непатрэбнай і за ўвесь час свайго знаходжаньня ў банку кніг не правяраў. Рацыяналізацыя? Дзе там! Конюх задаволены, калі яго не чапаюць—будзе вам ён займацца рацыяналізацыяй... Наадварот: Конюх лічыць адзнакаю «добрага тону» ўтойваць ад адміністрацыі банку ўсякія ненармальнасьці. Аб адносінах яго да савецкае ўлады гавораць многія факты. Іх ёсьць досыць у распараджэньні камісіі па чыстцы. Ёсьць і факты цяганіны (выпадак з чэкам БВА, які праваляўся некалькі месяцаў). Ёсьць і інш. факты, якія гавораць аб тым, што Конюху давяраць нельга. А банку патрэбны людзі абсалютна сумленныя, адданыя справе рабочае клясы, а калі ёсьць сумненьне, лепш ад такога чалавека пазбавіцца...

Пойдзем далей. Паглядзім, што прадстаўляе сабою скарбнік **Вій,** ці можна з ім пабудаваць сацыялізм.

Ня будзем ужо гаварыць пра тое, што Вій—антытрамадзкі працаўнік, не наведвае сходаў, не вядзе ніякае эканом. работы, пытаньні рацыяналізацыі апарату ад яго таксама далёкі, як зямля ад Юпітэра,—ёсьць у нас шмат такіх. Але хто абавязан цярпець яго грубыя адносіны да наведвальнікаў? А такіх фактаў колькі хочам. Ніколі ня дасьць растлумачэньня: скажа груба «тал», або «не» і каціся далей.

Скарбнік Вій здольны нават на тое, каб пазычаць супрацоўнікам некаторыя сумы грошай з... **дзяржаўнае касы.** Ад такое «дробязі» недалёка і да растраты. Ідзі потым, разьбірайся...

А вось і трэці «будаўнік сацыялізму» —загадчык аддзелам пасыўных апэрацый **Каляда.** Сын папа, які быў актыўным членам «Саюзу архангела Міхаіла». У свой час быў актыўным калчакоўцам, дапамог чэхаславакам вывезьці золата з Казані. Праўда, Каляда тлумачыць гэта проста няведаньнем, ня ведаў, што сьпераду знаходзяцца чэхаславакі... Але гэта ў мінулым, а вось сучаснае... Выпадак з фальшывым чэкам на 3.800 руб.—гэта справа рук Каляды. Аплата фальшывага чэку на такую буйную суму даказвае яго казённыя адносіны да справы.

Як адміністратар—нікуды ня варты. Ня ўмее разьмяркоўваць работу сярод працаўнікоў аддзелу. Многія недагружаны, а сам ён перагружан, але карысьці ад гэтага мала. Рацыяналізацыі баіцца, як агню, а таму ўхіляецца ад ўсякіх рацыяналізатарскіх нарад.

Ну, а наконт давер'я да яго—і гаварыць няма чаго. І мінулае яго, і цяперашняе—усё рэкамэндуе яго з адмоўнага боку..

Вось з такімі людзьмі і прыходзіцца Дзяржбанку працаваць. Праўда, у банку такіх ня шмат, але ўсё-ж да гэтых трох можна было-б дадаць яшчэ некалькіх чалавек, якіх лепш было-б трымаць ад дзяржаўных каштоўнасьцяй далей, каб «ня ўводзіць у грэх».

Чыстка банку, будзем спадзявацца, прафільтруе склад банкаўскіх працаўнікоў і вызваліць месца для людзей іншага ўкладу, для людзей, якія ўдзелам у нашым будаўніцтве паказалі сваю адданасьць справе рабочае клясы.

БАНКАВЕЦ.

Як працуе апарат Усекабанку

Калі хто быў ва Ўсекабанку, дык заўважыў, як працуе апарат, яму маглo-б здавацца, што быццам усё добра. Сядзяць за столікамі людзі, капаюцца ў паперах, за бяляскамі стаяць наведвальнікі,—усё, як належыць. Але ёсьць сярод наведвальнікаў пчасьліўцы і іх справа праходзіць хутка, а ёсьць і такія, справа якіх вельмі марудна пасоўваецца праз апарат. Дзе тут сабака закапана—наведвальнік ня ведае, але апарат павінен гэта ведаць. Спынімся на канкрэтных фактах.

Выдачу грошай па чэках і прыём іх на бягучыя рахункі робіць загадчык аддзелу **Папякоў.** Працуе на гэтай пасадзе з пачатку існаваньня банку, здаецца, ён павінен быў вывучыць добра справу. Але за ўвесь час ніякае прапановы аб паляпшэньні ці рацыяналізацыі працы не зрабіў і не падумаў зрабіць яе. Чакаў, што другія зробяць.

Працуе ён «пастарому», але і старое дрэнна выконвае. Даверанасьці і іншыя дакументы, якія паказваюць права трымальнікаў грошай, ужо з год, як згубілі сваю каштоўнасьць, бо тэрмін гэтым дакумантам даўно прайшоў. Толькі рэвізія гэта заўважыла і прапанавала кіраўніку пашукаць другога загадчыка, а яго зьмясьціць на ніжэйшую працу.

У пераводным і фондавым аддзеле не абыходзіцца без цяганіны, бюракратызму і пратэкцыанізму. Больш за ўсё шануе загадчык аддзелам Лекаў «паненак» з чырвонымі губкамі і ў прыгожых капялюшыках, бо ім пераводы заможных робіцца без чаргі. Зусім іншыя адносіны да старога замурзанага.

— Вам перавод?—зварачаецца загадчык.—Ведаеце, што ліміт заняты. Калі хочаце, запішэцеся ў чаргу.

— А калі гэта будзе?

— Праз два тыдні.

Чакае наведвальнік чаргі. Прашло два тыдні, а чарга зноў прасуналася таксама на два тыдні. З дакумантамі—фармалізм. Бываюць выпадкі, калі Лекаў на аднэй і тэй-жа справе пасылае выпраўляць дакументы па тры разы.

Калі хто прыходзіў купляць пазыкі ў банк, дык загадчык аддзелу Лекаў пасылаў купляць іх у Дзяржбанк ці касу ашчаднасьці, бо там «большы выбар» і лепш працуюць, а «ва Ўсекабанку пазык няма». Калі-ж праперылі, дык у касе знайшлі на 30.000 рублёў аблігацый пазык. Насьценгазэта за гэта яго добра прабрала калектыў працьвердзіў, а кіраўнік не пашанаваў.

Лекаў лічыць сябе карэспандэнтам-эканамістам, але ніякае эканамічнае працы не вядзе. Мусіць, гэтую назву эканамістага прысвоіў толькі таму, што скончыў беларускі дзяржаўны універсытэт. У эканомкамісіі і эканомнарадах ня ўдзельнічае і ніякага спрашчэньня сваёй працы ня робіць, бо ён вельмі вялікі прыхільнік старое банкаўскае тэхнікі.

Працоўная дысцыпліна ў Лекаха кульгае і ён ёю мала цікавіцца. Месяц таму прыходзіў са спазьненьнем кожны дзень на паўгадзіны, за што атрымаў вымову ад адміністрацыі. Ён не паважае адміністрацыю і лёгкую кавалерыю, бо яна да яго «прыдзіраецца». Загадаў кіраўніка ня выконвае: «Я их не принимаю»—моцна заявіў на ўсю залю. За гэты ўчынак атрымаў вымову з папярэджаньнем. Навучыць маладога працаўніка тав. Брэсьлера банкаўскай справе не жадае. Працуй сам, як ведаеш, калі цябе на працу мясцком высунуў. Гэта сакрэт эканамістага.

У вучотна-пазычковым аддзеле дрэнных зьявішч заўважыць ня можна. Тут праца ідзе шпарка, кліенты хваляць загадчыка **Шмурака,** але калі бліжэй прыгледзецца, дык недарэчнасьці таксама ёсьць. Загадчык аддзелу сам добра працуе, але падпарадкаваныя яму працаўнікі **сакрэтаў яго ня ведаюць,** бо ён іх трымае ў галаве.

Галоўная бухгальтэрыя, хоць па сутнасьці справы павінна кіраваць усёй рахунковай справай у банку, але фактычна яна нічым ня кіруе. Гэта заўважана пры агляде працы банку рабочай брыгадай і аб гэтым гаворыць сам кіраўнік банку. Сама бухгальтэрыя гэтаму не супярэчыць, ускладае ўсе гэтыя хібы на вялікую нагрузку. Абсьледвальнікі ўстанавілі, што галоўны бухгальтар не заглядвае ў аддзелы і ня ведае, як працуюць падпарадкаваныя яму аддзелы. Адсюль памылкі, а ўстанова церпіць непатрэбныя выдаткі.

Намесьнік галоўнага бухгальтара **Гранат** добры працаўнік, але падыходзіць фармальна да зьніжчэньня цяганіны. Калі яго мясцком высунуў у камісію па аглядзе справы на цяганіну па допісе ў насьценгазэце, дык ён, будучы старшынёю камісіі, справу вырашыў так, што вінаватага камісія не знайшла. Мясцком не згадзіўся з гэтым, даручыўшы яшчэ раз прагледзець справу, і вінаваты быў знойдзен.

Сацыялістычнае спаборніцтва абгаворвалася на эканомкамісіі і мясцкоме, вызначана рад мерапрыемстваў, але калі трэба было абгаварыць на агульным сходзе калектыву, дык яго зьбіралі два разы і яўка была вельмі дрэнная. Гэта сьведчыць, што апарат цалкам не пераканаўся вялікаю справаю.

Удзельнік агляду.

ГАСТРАЛЕРЫ З НАРКАМФІНУ

або аб тым, як ня трэба скарыстоўваць дзяржаўныя сродкі

Агульныя асыгнаваньні на дарожныя выдаткі ў НКФ з кожным годам скарачаюцца. Напр., у 1926-27 бюджэтным годзе было выдаткавана 23.213 р., у 1927-28—14.011 р. і ў 1928-29 г. асыгнавана 12.856 р.

Такім чынам, на першы погляд здаецца, што тут ёсьць значныя дасягненьні ў напрамку зьмяншэньня выдаткаў на камандыроўкі. Аднак, калі прыняць пад увагу, што апарат НКФіну ў 1926-27 г. складаў каля 270 чалавек, а зараз—128 чал. і што ў 1926-27 г. сутачныя аплачваліся з разьліку аднэй дваццацаць чацьвёртай, кватэрныя—50 проц. сутачных, а зараз сутачныя выплачваюцца з разьліку $^{1}/_{30}$, а кватэрныя на фактычным конце, дык стане зусім відавочным, што выдаткі на камандыроўкі ня зьменшыліся, а ўзрасьлі ў параўнаньні з ранейшымі асыгнаваньнямі, бо скарачэньне асыгнаваньняў утворана па прычынах незалежных ад НКФ.

На камандыроўкі ў Маскву выдаткоўваецца 50 проц. усіх асыгнаваньняў

Асноўным артыкулам выдаткаў па камандыроўках складаюць камандыроўкі ў Маскву. Гэтыя камандыроўкі, з аднаго боку, зьвязваюцца з пытаньнямі розных нарад і дзяржбюджэтам і бяз іх, бязумоўна, абыйсьціся нельга. Але затое з другога боку значная частка камандыровак у Маскву зьвязваецца з пытаньнямі: «для высьвятленьня пытаньняў, што могуць узьнікнуць у працэсе працы» (якіх пытаньняў?), для высьвятленьня розных пытаньняў па мясцовых фінансах і інш.» (глядзі пляны камандыровак за 1927-28 і 1928-29 г. г.). Такім чынам, большасьць камандыровак у Маскву зьвязваецца з паездкамі выпадковымі, якія зусім не прадугледжваюць плянамі, не выцякаюць і ня ўвязваюцца з агульнай працай таго ці іншага кіраўніцтва, або ўсяго наркамату ў цэлым.

Пляны камандыровак толькі на паперы

Вэдлуг пляну, складзенага паасобнымі кіраўніцтвамі Наркамфіну і прагледжанымі агульным кіраўніцтвам, на 1928-29 апэр. год па цэнтральным апараце прадугледжана 88 камандыровак, з якіх у Маскву **2 каманды

ЗЬВЯЗДА
МЕНСК

Усе беларускі зьезд упоўнаважаных сампрамкаапэрацыі

Даклад т. Брыскіна

7 ліпеня зьезд заслухаў справаздачны даклад старшыні Белсампрамсаюзу тав. БРЫСКІНА, які сказаў:

— Саматужна-прамысловая сыстэма ў Беларусі зусім маладая. Пачалі працаваць фактычна ў пачатку 1926 г. Калі на 1 кастрычніка 1926 г. арцеляй было 175 з лікам членаў 1.911, то на 1 кастрычніка 1928 г. налічваецца ужо 700 арцеляй таварыстваў з лікам членаў 27.131. На першае красавіка 1929 г. у адных арцелях занята 14.664 ч.

Усяго па Беларусі 107.000 саматужнікаў з гэтай колькасьці каапэравана толькі 35 проц. Гэта яшчэ не значны процант.

Самы высокі рост каапэраваньня саматужнікаў у горадзе і самы нізкі ў вёсцы. У гарадох на 1 кастрычніка 1928 г. было 288 арцеляй, а ў вёсцы на гэты тэрмін ўсяго 100.

Зусім незначная колькасьць партыйцаў у арцелях. Толькі за апошні год партыйная праслойка стала павялічвацца.

Значныя дасягненьні мае сампрамкаапэрацыя ў адносінах вучнёўства. Лік вучняў складае 1190 агульнага ліку членаў арцеляй. Такога вялікага процанту ня ведае РСФСР.

Прароблена даволі вялікая культурная работа. У 1927-28 г. існавалі 6 месячныя курсы для членаў арцеляй у Менску, вёсьць у Менску вечэрняя школа для моладзі саюзу саматужнікаў, дзе навучаецца 250 ч. У Гомелі пры школе мэталістых працуюць курсы па падрыхтоўцы кваліфікаваных саматужнікаў, у Бабруйску школа шыцьця на 60 ч. і г. д.

***

Па справаздачным дакладзе т. Брыскіна разгарнуліся жававыя спрэчкі. Таварышы якія выступалі ў спрэчках, зазначалі, што ІНСТРУКТАРСКІ АПАРАТ САЮЗАЎ НЕ АДПАВЯДАЕ запатрабаваньням арцеляй. Інструктары не выяжджаюць, на месцы, не ўказваюць як працаваць і г. д.

Дрэнна стаіць справа з ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕМ АРЦЕЛЯЎ СЫРЦОМ. Лесапрамысловыя арцелі ня ўпэўнены ў тым, што з імі будзе заўтра.

Фінансавае становішча большасьці арцеляй дрэннае. Ня гледзячы на гэта, гарсаветы ўзьнімаюць вялікую плату за памяшканьні.

Дрэнна пастаўлена аболугоўваньне саматужнікаў у тых акругах, дзе няма саюзаў саматужнай каапэрацыі.

***

Зьезд аднагалосна пастанавіў да кастрычніка месяца пабудаваць самалёт «Каапэраваны саматужнік». Сярод дзеляцтатаў зьезду праведзены збор на пабудову самалёту.

***

Пры клюбе саўгандальслужачых, дзе адбываецца зьезд, арганізавана выстаўка вырабаў сампрамкаапэрацыі. Экспанаты, займаюць тры паркі. На выстаўцы ёсьць экспанаты дрэваапрацоўчых арцеляй абутковых, арцелі па вырабе мыла, вопратні, гадзіньнікаў і г. д.

Рабочыя мопраўцы ў лягерах кавалерыстых

Інтэрнацыянальная экскурсія мопраўскага актыву

А 9 гадзіне раніцы калёна з 800 мопраўцаў накіравалася на вакзал. У паветры—чырвоныя сьцягі т-ва былых паліткатаржнікаў і палітэмігрантаў, мопраўскіх арганізацый і плякаты.

Толькі цягнік рушыўся, як ужо з вагонаў пачуліся сьпевы і гукі струннага аркестру.

У Ждановічах мопраўцаў сустракалі чырвонаармейцы в лягэраў з аркестрамі музыкі.

У лягэрах мопраўцы разышліся па палатках, хутка пабраталіся з чырвонаармейцамі, камандзірамі, а многія пашлі на сход, дзе праводзілася чыстка партыйцаў.

Дрэннае надвор'е прымусіла некалькі павьней, чым было намечана, адкрыць мітынг.

Ад Менакругкому МОПР'у мітынг адкрыў тав. **Цудзін**, які адначыў мэты гэтай экскурсіі, што яна павінна паслужыць пачаткам больш ценнай працы ўсіх мопраўцаў-рабочых, сялян і чырвонаармейцаў па дапамозе ахвярам фашызму.

На трыбуне старшыня ЦК МОПР'у БССР—т. **Славінскі**. Ён у сваёй прамове заклікае мопраўцаў да інтэрнацыянальнай салідарнасьці, быць перадавым атрадам па абароне СССР ад нападу капіталістых.

З гарачым прывітаньнем выступіў на ангельскай мове ад амэрыканскай кампартыі, амэрыканскіх рабочых і 15 мільёнаў нэграў прадстаўнік выканкому МОПР'у і член ЦК Усеамэрыканскага МОПР'у тав. **Карлтон**. Ён гаворыць: «Амэрыканская кампартыя здолела арганізаваць чорных і белых працоўных у адзіны саюз для змаганьня з амэрыканскім капіталам. У Паўночнай Амэрыцы бастуе 50.000 чорных і белых вуглякопаў. Амэрыканская кампартыя выкрывае падрыхтоўку новай вайны. Амэрыка асыгнавала 100 мільён. даляраў на пабудову вялікага, моцнага флёту.

Потым выступалі ад т-ва былых палітказтаржнікаў тав. **Саламонаў**, чырвонаармеец **Максутаў** (на татарскай мове), ад менскіх рабочых—т. **Бэрнацкі** (на польской мове), чырвонаармеец **Харчун** (на украінскай мове), ад рабочых-будаўнікоў т. **Офлі-Задэ** (на турэцкай мове), ад Кастрычнікавага РК МОПР'у т. **Хмялеўскі** і камісар дывізіі т. **Бачароў**.

Аднагалосна прынята прапанова паслаць прывітаньне мітынгу пленуму Вык. Камінтэрну.

У канцы ў лягэрным клюбе адбыўся канцэрт, на якім прысутнічала каля 2.000 экскурсантаў і чырвонаармейцаў.

МОПРАВЕЦ.

Дзень каапэрацыі ў Менску

У суботу ў памяшканьні Белдзяржтэатру адбыўся ЎРАЧЫСТЫ СХОД КААПЭРАЦЫЙНАГА АКТЫВУ, прысьвечаны міжнароднаму дню каапэрацыі. З дакладам аб значэньні сьвята выступіў старшыня Белкаапсаюзу т. БАЛЦІН. Сходам пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, акругкому КП(б)Б, Цэнтрасаюзу, ЦСПСБ і Цэрабэжцы.

***

У нядзелю ў садзе «Прафінтэрн» адбылося ГУЛЯНЬЕ ПАЙШЧЫКАЎ. Быў арганізаваны кніжны кірмаш, выстаўка крамы «маці і дзіця».

Адбылася ЗАКЛАДКА БУДЫНКУ ДЛЯ ХАВАНЬНЯ ГАРОДНІНЫ МЦРК. Пабудова будзе закончана да восені і абыдзецца ў 60.000 р.

***

У нядзелю быў заложаны НОВЫ БУДЫНАК ВЯЛІКАЙ КААПЭРАЦЫЙНАЙ КРАМЫ ў рабочым раёне па Шырокай вуліцы з прамовамі выступалі старшыня МЦРК т. Кац, рабочыя і работніцы. Пабудова будзе скончана праз 3 месяцы.

***

Па ўсіх прафсаюзных садох і буйных прадпрыемствах былі праведзены СХОДЫ І ВЕЧАРЫ з дакладамі аб міжнародным дні каапэрацыі

За дзень

Саматужная вытворчасьць ватэрпасаў

У Менску арганізавалася новая саматужная арцель—па вырабе ватэрпасаў. У першыя месяцы арцель будзе выраблять 3-4 тысячы ватэрпасаў у месяц.

Масавая мастацкая праца. 24 ліпеня ў Маскве адбудзецца ўсерасійская канфэрэнцыя па масавай мастацкам працы, на якую запрошаны прадстаўнікі саюзных рэспублік. Наркамасьветы БССР пастанавіў камандыраваць свайго прадстаўніка на гэту канфэрэнцыю.

Спаборніцтва ў яўрэйскім тэатры. Дырэкцыя яўрэйскага тэатру абвясьціла спаборніцтва паміж працаўнікамі калектыву на належную падрыхтоўку да пастановак бягучага году. Прапанова дырэкцыі прынята агульным сходам.

Новы рэпэртуар яўрэйскага дзяржтэатру. У бягучым годзе ў рэпэртуар яўрэйскага тэатру уключаны 3 новыя п'есы: «Стэп гарыць»—Вавёркава, «Амэрыка»—Годзінэра і «Паздымак машын»—Долгапольскага.

Канфэрэнцыя с.-г. крэдытных таварыстваў. Праўленьне Менсельскрэдытсаюзу склікае на 17 ліпеня канфэрэнцыю ўпоўнаважаных с.-г. крэдытных таварыстваў.

Здарэньні

Аўтамабіль задушыў жанчыну. 7-га ліпеня раніцою праяжджаўшы па вуліцы Энгельса аўтамабіль №-га стралковага палка наскочыў на грамадзянку Лібэрман. Апошняя задушана на месцы.

***

На фурманку селяніна хутара Тачыліна, Самахвалавіцкага раёну, які ехаў у Менск са сваёю сям'ёй, наскочыў аўтамабіль. Удар быў настолькі моцны, што дзіця селяніна забіта на сьмерць, а жонка, цяжка параненая, адвезена у бальніцу.

Стан ураджаю і надвор'е ў БССР

Паводле вестак цэнтральнай статыстычнай управы віды на ўраджай на 1-га ліпеня ва ўсіх акругах БССР здавальняючыя.

Мінулы месяц быў ня вусім спрыяючым для росту расьлін; тэмпэратура была ніжэй нармальнай, таксама назіраўся недахват атмасфэрных ападкаў, асабліва ў 1-й і 2-й квадрах. Наогул чэрвень можна характарызаваць недахопам ападкаў.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя затрымліваючыя рост расьлін фактары, яны фактычна не адбіліся адмоўна на ўраджай.

Азіміна на 1-га ліпеня ў сярэднім па ўсёй БССР засталася стабільнай—3,2 бала (у параўнаньні з ацэнкай на 15 чэрвеня). У некаторых акругах назіраецца нават некаторае паляпшэньне, асабліва ў Гомельшчыне, Аршаншчыне, Полаччыне. Калі параўнаць становішча пасеваў з мінулым годам, дык сёлета ёсьць павышэньне на 0,2 бала.

Стан ярыны на 1-га ліпеня мае наступны выгляд: ячмень—3,0, авёс—3,0, пшаніца-ярыца—2,9, проса—2,7, грэчка—2,6, а ўся ярына наогул—3,0 балы. Калі-ж параўнаць з ацэнкай на 15-га чэрвеня, дык маем наступнае: авёс, ячмень і гарох—стабільны, пшаніца-ярыца і проса даюць паляпшэньне на 0,1 бала.

Робачы параўнаньне з ацэнкай ярыны па гэтае-ж чысло мінулага году, дык сёлета ячмень дае павышэньне на 0,8 бала, а авёс—0,6 бала, яравая пшаніца і проса—0,5 бала.

Тэхнічныя расьліны таксама даюць паляпшэньне: бульба—3,0 (летась 2,1), лён—2,9 (летась 2,3), канопілі—2,9 (летась 2,5).

Асабліва заўважаецца гэтае паляпшэньне ў параўнаньні з мінулым годам на траву: канюшына—3,5 (супроць леташніх 2,6), віка—3,0 (летась 2,6), заліўныя сенажаці—3,3 (летась 2,4), сухадольле—3,1 (летась 2,6).

***

Сярэдняя тэмпэратура чэрвеня была ніжэй нармальнай. Што датычыць ходу сярэдніх тэмпэратур, то выяўляецца, што з 1-га па 10-га чэрвеня і з 20-га па 30-га чэрвеня адначана сярэдняя тэмпэратура крыху вышэй нормы.

Адносна ападкаў толькі ў пэрыяд з 10 да 20 чэрвеня ў БССР мясцамі адначана вельмі нязначная колькасьць ападкаў, мясцамі іх поўная адсутнасьць, што крыху затрымала рост палявых культур (больш ярыны і менш азімых).

Дажджы ў канцы чэрвеня адразу адбіліся на стане хлябоў у сэнсе паляпшэньня росту ярыны і жыта.

Наогул як з боку тэмпэратуры, ападкаў, вятроў і сонечнага цяпла, надвор'е да гэтага часу можна лічыць здавальняючым для сельска-гаспадарчых культур.

Забойства 8 чал. на хутары

9-га сакавіка т. г. увечары на хутары Нятраўля, 2 вярсты ад сяла Данілавіч (Гомельская акруга), здарылася жахлівая па сваёй жорсткасьці забойства.

У хаце заможнага селянна Маршына знайшлі 8 чалавечых трупаў, сярод іх грудное дзіця. Сьледчыя, прыехаўшы на месца здарэньня, убачылі наступны малюнак: у адным з пакояў хаты Маршына ляжалі трупы старога і старой, дачкі, батрачкі, малалетняга батрака, двух дзяцей і Янкі Мельнікава—зяця Маршыных. Трупы дарослых былі паколаты ражнамі, прастрэлены, пасечаны сякераю, а галовы дзяцей былі папрасяканы. Забойства было зроблена з мэтаю грабежніцтва.

5-га ліпеня Гомельскі акруговы суд слухаў гэтую справу. На лаве падсудных—чацьвёра. Чатыры маладыя сялянскія хлапцы. Самаму старэйшаму 22 гады маходшаму—17 год. Трое ўжо судзіліся і адбывалі кару ў папраўчым доме. Першую судзімасьць мае толькі адзін з абвінавачаных—Сьвірыдаў Ф. І., 22 год. Усе яны дзеці заможных і кулакоў.

Допыт падсудных разгортвае жудасны малюнак забойства, ён сьведчыць, што ў асобе падсудных мы маем прафесыянальных бандытаў.

***

А 2-й гадз. ночы, пасьля двухгадзіннае нарады, акрсуд вынес прысуд: у адносінах Мельнікава, Ленцава і Пацеева, як сацыяльна небясьпечных, ужыць вышэйшую меру сацыяльнае абароны—расстрэл. Прымаючы пад увагу няпоўналетні ўзрост Пацеева, замяніць апошняму расстрэл 10-цю гадамі зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, з высылкаю пасьля адбыцьця кары ў Салаўкі на 5 год. Сьвірыдаў прысуджан да 2-х год зьняволеньня.

Г—о.

Дзе прычына абвалу рыштаваньняў на пабудовах

Тэлеграф прынёс весткі аб няшчасных выпадках на будаўніцтве Гомелю і Віцебску. Віцебскі выпадак адносна «шчасьлівы»: рабочы зламаў сабе левую руку і пабіў галёнку. Гомельскі больш цяжкі: адзін рабочы памёр на месцы, а другі ў цяжкім стане дастаўлен у больніцу.

У Віцебску няшчасны выпадак здарыўся пры разборы каменнага трохпавярховага дому. У Гомелі выпадак меў месца пры фарбоўцы фасаду дому.

На паведамленьні карэспандэнтаў, агляд рыштаваньняў устанавіў, што яны не адпавядаюць правілам тэхнікі бясьпечнасьці: рыштаваньні былі слаба прымацаваны: дошка, на якой знаходзіліся рабочыя, была прымацавана адным трохцалёвым цьвіком.

Нам ужо прыходзілася летась пісаць аб тым, што рабочыя самі часта пагарджаюць элемэнтарнымі правіламі тэхнікі бясьпечнасьці, калі пабудова рыштаваньня ўваходзіць у іх абавязкі пры выкананьні зьдзельнай працы.

Некаторыя будаўнічыя арганізацыі (першы Белжылсаюз), з прычыны гэтага, сталі даручаць абсталяваньне рыштаваньняў асобным рабочым, што паленшыла якасьць рыштаваньняў. Да гэтага трэба перайсьці ўсім будаўнічым арганізацыям.

Тэхнічнаму пэрсаналу на работах ня трэба забываць аб характэрнай рысе псыхалёгіі рабочых-зьдзельшчыкаў: падрыхтоўка рыштаваньняў зьяўляецца для іх як-бы «накладным выдаткам» на асноўную працу. Таму з вялікай увагай трэба сачыць за яе выкананьнем. Бо так ці інакш тэхнічнаму пэрсаналу ня ўнікнуць адказнасьці ў гэтай справе.

Больш увагі пабудове рыштаваньняў!

ЖУЛЬКІН.

Транспартныя навіны

Пабудова аўта-гаражу ў Менску

Згодна прапановы аўтакіраўніцтва гараж для аўтабусаў і аўтамабіляў у Менску будзе пабудаваны не на 50 машын, як мерквалася раней, а на 100 машын. Гараж будуецца на конскім рынку на Камароўцы. У гэтым годзе будзе прыступлена да закладкі фундаманту гаражу. Пры гаражы будуць пабудаваны механізаваныя майстэрні па рамонце аўтамабіляў, арганізавана мэханічнае абмываньне машын і г. д. Пабудова гаражу будзе каштаваць каля 1 мільёну руб.

Новы аўтабусны рэйс

З серады пачаў курсаваць аўтабус па новым рэйсе Слуцак-Бабруйск. Аўтабус будзе хадзіць па гэтай лініі тры разы на тыдзень.

Паведамленьні

Выпуск антырэлігійных курсаў

Сёньня, 9 ліпеня 1929 г., роўна а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу К. Маркса адбудзецца вечар, прысьвечаны першаму выпуску цэнтральных антырэлігійных курсаў БССР.

Парадак дня:
1) Урачыстая частка.
2) Канцэрт.

Уваход па запрашальных білетах, якія выдаюцца фабзаўкомамі фабрык і заводаў і мясцкомамі ўстаноў г. Менску.

— Даводзіцца да ведама работнікаў кантор і экспэдыцый мясцовых і цэнтральных газэт і часопісяў, што ў сераду, 10-га ліпеня, роўна а 7 з пал. гадзіне ўвечары, у садзе друкарні «Зьвязда» (Савецкая, 63, ва дварэ) адбудзецца ПАШЫРАНАЯ ВЫТВОРЧАЯ НАРАДА па пытаньні распаўсюджаньня, экспэдаваньня і дастаўкі пэрыядычнага друку.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Даклад нам. заг. газэтным бюро тав. Башынкевіча аб яго азнаямленьні з пастаноўкай газэтнай справы ў Ленінградзе і ўжываньне вопыту Ленінграду ў Беларусі.

Запрашаюцца работнікі кантор і экспэдыцый газэт і ўсе жадаючыя.

У выпадку дрэннага надвор'я, нарада пераносіцца ў клюб наркомвнэсгі (будынак пошты, ва дварэ).

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, 9-VII, а 7 гадз. увечары адбудзецца адчытны сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы. Будзе распрацоўвацца інструкцыя аб чыстцы партыі.

Запрашаюцца асьветчыкі г. Менску.

— Жанадзел Кастрычнікавага РК КП(б)Б паведамляе, што ў сераду 10-га ліпеня г. г. а 7 гадзіне ўвечары склікаецца сход делегатак раёну ў садзе Наркамфіну, вул. Карла Маркса, а ў выпадку дрэннага надвор'я, у клюбе Леніна (бул. Чырв. Заля).

— У сераду, 10 ліпеня, а 7-й гадз. увечары у памяшканьні акругкому МОПР адбудзецца пасяджэньне Фрунзаўскага райкому МОПР'у.

Парадак дня: 1) Аб плане правядзеньня «Міжнароднага Чырвонага дню», 2) Аб плане работы РК, 3) Рознае.

— 15 ліпеня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу гарсавету (пляц Волі № 4, 3-ці паверх) адбудзецца нарада членаў абраных засядацеляў бюро скаргаў НК ССІ, кіраўнікоў груп і атрадаў ЛЕГКАВЕРНІ, што працуюць у бюро скаргаў па пытаньні:

«Вывікі пераабраньня засядацеляў і далейшай іх працы».

На нараду запрашаюцца добраахвотнікі якія працуюць у бюро скаргаў, прадстаўнікі ЦП саюзаў, фабзаўмясцкомаў і членаў секцыі РСІ гарсавету, прымацаваных да працы ў бюро скаргаў.

Гэтым біржа працы просіць апавясьціць прав газэту ўсіх беспрацоўных, што лічацца на вучоце біржы працы, што па 13 ліпеня г. г. утвараецца набор на кавальскі цэх курсаў ЦІП'у.

Прыём заяў утвараецца ад членаў саюзу па сваіх саюзах, а не ад членаў саюзу ў агульнай канцэляры біржы працы.

— У сераду 10 ліпеня 1929 г. а 6 гадз. увечары трэба зьявіцца ў АПА для праверні паступаючых у вячэрні камвуз наступным таварышом:

Серабранская М., Чарная І., Сідніная А. Грабоўскі Я., Пратусэвіч К., Мільнэр С. Марголін Н., Загорскі, Розанаў А., Вадна М., Карнейчык С., Марголін М., Татарскі П., Герман Ю., Цаўлоўскі К., Цэндзэр Г., Волін С., Зак Р., Фэрдман Ж., Кімінскі М., Матлок Х., а таксама і тым т. т., якія пададуць анкеты-заявы.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР, КІНО

Гастролі Маскоўскага 1-га рабочага Тэатру Пролеткульт
Тэатр „ПРАФІНТЭРН“ Аўторак, 9 ліпеня для членаў прафсаюзаў
„По ту сторону щели“
Пачатак а 8 г. 30 м. увечары.
Білеты ў рабочай касе з 12—2 і з 4—6 г., і з 6 г. у касе тэатру.

Кіно-сад „Чырвоная Зорка“ ад аўторка, 9 ліпеня
мастацка-гістарычны фільм
КНЯЗЬ ЦЭРАН
драма ў 6 частках.
Пачатак сэансаў а 9 г. 15 хв. Каса—ад 7 гадз.
У садзе ад 7 гадз. грае духавы аркэстр.

КІНО „Інтэрнацыянал“
Ад аўторка, 9 ліпеня мастацкі фільм
НАПЯРЭДАДНІ
(НАКАНУНЕ)
драма ў 6 частках.
У галоўнай ролі А. Бучма (вядомы па фільмах «Тарас Шэўчэнка», «Джымі Хігіно»)
Звыш праграмы: ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 14
1) 10-ці гадовы юбілей Самарскай канадыізіі імя Ангельскага пралетарыяту. 2) Кніжны базар. 3) Прыезд французкай капэрацыйнай дэлегацыі. 4) Вучэбны паход працоўных Менску. 5) Таварыскі турнір паміж шахматыстычі БССР і Ленінграду. 6) Адкрыцьцё лягераў.
Пачатак 1 с. ад 7 с пал. г. увеч. Каса ад 5 с пал. г. увеч.

Кіно „Пралетары“ Ад аўторка 9 ліпеня
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ЗА СЬЦЯНОЮ
(ЯЗЫК СТЕН)
драма ў 7 частках
У галоўнай ролі А. Бучма
звыш праграмы кіно хроніка „Совкіно“ № 33,
прысьвечаная падзеям 1-га мая ў Бэрліне
Увага! Здымкі зроблены ручным аўтаматычным апаратам ва ўмовах вулічнай бойкі, з пад'езда, у вакон і дахаў дамоў.
Пачатак сэансаў а 7 з пал. 9 і 10 г. 30 м.
Каса ад 6 гадзін

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“
Ад аўторка, 9-га ліпеня
па прычыне вялікага посьпеху
2-гі тыдзень! 2-гі тыдзень!
ХВОІ ГАМОНЯЦЬ
вытворчасьць БЕЛДЗЯРЖКІНО.
Пачатак сэансу роўна а 8 гадз. Каса адчынена з 6 гадз.

КІНО „СПАРТАК“ Сёньня, 9 ліпеня
БАЯВІК АЛІМ (КРЫМСКІ ДЖЫГІТ) БАЯВІК
драма ў 10 частках
Каса адкрыта ад 6 гадз.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

ЮЖХИМТРЕСТ
ЛУЧШИЙ СОВЕТСКИЙ КАРАНДАШ
ГЕНЕРАЛЬНЫЙ ПРЕДСТАВИТЕЛЬ ХИМСИНДИКАТ

РВА ЦСПСБ
Вышла з друку і паступіла ў продаж кніга
В. П. СУШЧЫНСКАГА (юрысконсульта ЦСПСБ)
„Законадаўства аб працы СССР і БССР“
Стар. 349; цана у пераплёце—3 руб.
Прадаецца ў РВА ЦСПСБ (Менск, Дом Працы) і ва ўсіх кнігарнях БССР.

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ Натуральныя Мінэральныя Воды
НАРЗАН
ЭСЕНТУКІ № 20
Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4 | БАТАЛІНСКАЯ
„ № 17 | СЬМІРНОУСКАЯ
„ № 18 | СЛАВЯНАУСКАЯ
БАРЖОМ
Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.
Патрабуйце ўсюды каўкасія натуральныя мінэральныя воды!
Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.
Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 23-92, тэл. 374.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

СЁНЬНЯ, у АЎТОРАК 9 ЛІПЕНЯ
ДЗЯРЖЦЫРК Гастролі лепшага муштравальніка
Уладзімера ДУРАВА (маподшага)
другі цыкль праграмы Дурава.
1-шы раз у БССР індыйскі муштраваны СЛОНЬ Макс
1-шы раз у БССР Расійскі атрацыён сталевыя канітаны Бр. МІЛАСЛАУСКІЯ
1-шы раз у БССР—адзіная выканальніца пад купалам цырку штэйн-трапэ—ГЕРЦОГ
1-шы раз 4 ЛЮІДЖЭ-МАРОС 4 турністыя і яшчэ рад нумароў.
Па прычыне грандыёзнай праграмы пачатак роўна а 9 гадз. увеч.

16-га ліпеня г. г. у саўгасе Цяцерына, Арш. акругі адбудуцца ТАРГІ на здачу ў аренду саду, плошч. 15,5 гакт. з поўнымі урадж. Жадаючыя прыняць удзел у таргах павінны зьявіцца да назнач. тэрміну у кантору саўгасу. У выпадку, калі 16-га ліпеня таргі не адбудуцца, у другі раз таргі назначаюцца 18 г. м.

ПЕРАДАЕЦЦА ЛЕДНІК набіты лёдам. Даведацца: Нямігa, 23, Клячкін.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА МЭДЫКА-САНІТАРН. Т-ВА
Ленінская (побач з 2-м Домам Саветаў), № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 г. дня да 9 г. увеч
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: Унутраныя, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вены нораў, вуха, горла, носа і скуры
Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвета-лячэньне.
Рэнтгэнаўскі габінэт робіць здымкі, праасьвечваньні і лячэньне хворых
Прыём хэміка-бактэрыял. аналізаў
Кансультацыя прафсаюзаў—прыём хворых па ленавых кніжках таварыства
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную плату.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты
лічыць несапраўднымі
Лекавая кніжка Слуцкай-Марголінай Б. В., выд. Мевстрахкасай. 2009
Членская кніжка № 2059 Шульц А. І., выд. саюзам саўгандальслужачых. 2010
Вуч.-конская кніжка Ерахаўца Л. І., выдан. Астраш.-Гарадз. РВК. 2011
Лекавая кніжка Конэ Я. Р., выд. Менскай страхкасай. 2012
Членская кніжка саюзу мэхсанпрацы № 1025 Кірвеля А. Ц. 2013
Асабовая пасьведч. Прахоцкага А. Г., выд. Любанскім райкомам КП(б)Б. 2014
Членск. кніжка № 31162 Хаменка В. Г., выд. саюзам Рабземлес. 2015
Патэнт Вінера І. З., выд. Менакрфінадзелам. 2016
Каапэрац. кніжка Юхновіча У., выд. Менскім прыгар. спажывецкім т-вам „Земляроб“. 2017
Пашпарт Герцык І. М., выд. Менскай міліцыяй. 2018
Два лесарубачныя білеты Гайдукевіча Б., выд. Заслаўскім лясьніцтвам. 2019
Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакуманту

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА“ званеце па тэл. 7-81

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ званеце па тэл. 2-49

Прыбілася СУКА пароды «Сэтр—Гардон», чорная, з белымі грудзьмі. Праз 3 дні лічу СВАЁЙ. Адрас: Кладбішчанская, 29, Сьцяпанава.

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3ці ПАВЕРХ.
ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЬ, ЭТЫКЭТЫ, ДЗЯЛЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА“ Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск